ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 19 (878) | Субота, 10 мая 1952 года | Цана 50 кап.

Споўнілася сем год з дня разгрому совецкімі ўзброенымі сіламі германскага фашызма. Няхай жыве вялікі совецкі народ, народ-пераможца! Слава нашаму любімаму правадыру і палкаводцу таварышу Сталіну!

Дзень Перамогі

Штогод народы нашай вялікай Радзімы адзначаюць векапомную дату ў гісторыі чалавецтва — Дзень слаўнай Перамогі над гітлераўскай Германіяй.

Сем год таму назад, 9 мая 1945 года, звяртаючыся да совецкіх людзей, найвялікшы геній сучаснасці, правадыр і палкаводзец, натхніцель і арганізатар нашай перамогі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін сказаў:

«Вялікія ахвяры, прынесеныя намі ў імя свабоды і незалежнасці нашай Радзімы, незлічоныя цяжкасці і пакуты, перажытыя нашым народам у ходзе вайны, напружаная праца ў тылу і на фронце, аддадзеная на алтар Айчыны, — не прайшлі дарэмна і ўвянчаліся поўнай перамогай над ворагам».

Гістарычнае значэнне гэтай выдатнай перамогі добра разумее ўсё перадавое прагрэсіўнае чалавецтва. У барацьбе з фашысцкімі захопнікамі совецкі народ адстаяў не толькі свабоду і незалежнасць сваёй социялістычнай Радзімы, але і выратаваў усе народы Еўропы ад фашысцкага ярма.

Калі гітлераўскія полчышчы напалі на совецкую зямлю і пачалі свой нечуваны гвалт і здзек над нашымі людзьмі, тагачасныя правіцелі Еўропы і Амерыкі, разнастайныя ваенныя аўтарытэты і эканамічныя эксперты — усе ў адзін голас прадракалі Совецкаму Саюзу немінучае паражэнне. Ужо ў жніўні 1941 года ў берлінскіх атэлях па самай высокай цане прадаваліся пакоі, якія выходзілі вокнамі на галоўную вуліцу Унтэн дэн Ліндэн, адкуль можна будзе паглядзець на трыумфальны парад войск, што вярнуцца дамоў пасля пакарэння Расіі. Кінематаграфічныя фірмы рыхтаваліся «ўвекавечыць» на кіналентах уступленне фашысцкіх армій у Маскву. Увосень таго-ж года гітлераўскія юрысты абвясцілі «закон»: «Уся маёмасць, належыць яна дзяржаве ці прыватным асобам, на ўсёй прасторы ад Нёмана да Владзівастока, з гэтага часу — наша». У газетах шырока абмяркоўвалася «неадкладнае» пытанне: што рабіць з рускімі? Частку, вядома, трэба пакінуць у жывых, як танную рабочую сілу, а ўсіх астатніх — знішчыць. «Няма чаго непакоіцца, — пісала гітлераўская газета, — рускага рэванша не будзе, таму што рускіх не будзе».

А імперыялісты Амерыкі і Англіі рабілі свае разлікі, будавалі свае планы.

Спусціўшы з ланцуга фашысцкага звера, яны спадзяваліся, што Совецкі Саюз выйдзе з вайны зняможаным і бяскроўным, і тады яны, імперыялісты, прадыктуюць нашаму народу сваю волю. Тры гады наўмысля зацягвалі яны адкрыццё другога фронта ў Еўропе і вымушаны былі пачаць высадку сваіх войск толькі тады, калі зыход вайны ўжо быў вызначаны, калі ўсім было ясна, што перамога на баку Совецкага Саюза.

Разграміўшы гітлераўскую Германію, у распараджэнні якой знаходзіліся вытворчасць і матэрыяльныя рэсурсы ўсёй Еўропы, совецкі народ паказаў усяму свету сваю непераможнасць, сілу і магутнасць свайго социялістычнага ладу, сілу і магутнасць сваёй дзяржавы. Наша слаўная перамога прадэманстравала перад светам усю веліч маральна-палітычнага адзінства совецкага грамадства, непахіснасць дружбы народаў нашай Радзімы, мудрасць кіраўніцтва большэвіцкай партыі. Геніяльны правадыр і палкаводзец таварыш Сталін у цяжкія гады вайны цвёрдай рукой вёў наперад армію і народ і прывёў краіну да такой бліскучай перамогі, якой яшчэ ніколі не ведала гісторыя чалавецтва.

Сярод прычын, якія абумовілі разгром фашысцкай банды, не лішне ўспомніць і тое, што гітлераўцы, іх натхніцелі і прыхільнікі абсалютна не разумелі, на каго яны падымаюць руку, не разумелі, як не разумеюць і падбухторшчыкі новай вайны, што такое совецкі народ і ў якую эпоху жыве краіна «паміж Нёманам і Владзівастокам».

У Дзень Перамогі ў сваім звароце да ўсіх сумленных людзей свету таварыш Сталін падкрэсліў, што Совецкі Саюз, разбіўшы ўшчэнт гітлераўскія войскі, не збіраецца, аднак, ні дзяліць, ні знішчаць Германіі, а імкнецца да таго, каб над Еўропай, над усім светам заўсёды развяваўся вялікі сцяг свабоды і міру паміж народамі. Сем год, што прайшлі з таго знамянальнага дня, бліскуча пацвердзілі, з якім натхненнем, з якім уздымам народы совецкай краіны змагаюцца за ажыццяўленне сталінскай палітыкі міру.

З першага-ж дня пасля пераможнага завяршэння вайны совецкія людзі прыступілі да выканання велічнай сталінскай праграмы мірнага будаўніцтва, дасягнуўшы такіх поспехаў у сваёй гераічнай стваральнай працы, якіх не ведала гісторыя. У шырокіх маштабах разгарнуліся работы па пераўтварэнню прыроды. Поўным ходам ідзе будаўніцтва буйнейшых у свеце гідраэлектрастанцый і каналаў.

Як-жа не радавацца нам, совецкім людзям, калі кожнае наша дасягненне служыць запаветнай мэце нашага жыцця — пабудове комуністычнага грамадства!

Побач з Совецкім Саюзам ідуць сёння краіны народнай дэмакратыі, вялікая Кітайская народная рэспубліка, народы гераічнай Карэі, В'етнама і народы, якія ўсё больш рашуча змагаюцца за сваё вызваленне. Справу міру бяруць у свае рукі мільёны простых людзей свету і змагаюцца за яе з усёй адданасцю і ўпэўненасцю ў сваёй перамозе. На нашым баку сёння і Германская дэмакратычная рэспубліка, якая з'яўляецца асновай будучай адзінай міралюбівай і дэмакратычнай Германіі.

Совецкі народ, які цвёрда і непахісна змагаецца за мір, пільна сочыць за ўсімі прошукамі падпальшчыкаў вайны. Совецкія людзі, не шкадуючы ні сваіх сіл, ні сродкаў, умацоўваюць магутнасць любімай Радзімы. Поспех падпіскі на новую Дзяржаўную пазыку, якая выпушчана гэтымі днямі, яшчэ раз пацвярджае, што совецкі чалавек не ўяўляе сваёй сілы, багацця і шчасця асобна ад багацця і шчасця сваёй дзяржавы, сваёй краіны.

Цесна згуртаваны вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол свайго любімага правадыра і настаўніка, совецкі народ упэўнена ідзе да сваёй вялікай мэты. І як-бы ні шалелі імперыялістычныя падпальшчыкі вайны, ім ніколі не ўдасца павярнуць ход гісторыі назад. Слаўная дата нашай перамогі яшчэ раз напамінае аб фантастычнасці і незбыўнасці новых спроб імперыялістаў устанавіць сусветнае панаванне над чалавецтвам.

Гістарычная перамога совецкага народа — павучальны ўрок усім падпальшчыкам вайны і іх натхніцелям.

У азнаменаванне свята

Працоўныя нашай рэспублікі разам з усім совецкім народам шырока адзначылі сёмую гадавіну гістарычнай перамогі совецкага народа над фашысцкай Германіяй. У чэсць усенароднага свята многія калектывы прамысловых прадпрыемстваў Мінска, Гомеля і іншых гарадоў завяршылі выкананне пяцімесячных вытворчых планаў. Працоўнымі поспехамі адзначыла 9 мая калгасная вёска. Сотні калгасаў завяршылі сяўбу збожжавых і пасадку бульбы. У чэсць Дня Перамогі неслі стаханаўскую вахту асобныя рабочыя — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, многія брыгады і змены фабрык і заводаў.

На прадпрыемствах, у калгасах і навучальных установах адбыліся гутаркі і даклады на тэмы: «Партыя Леніна—Сталіна — арганізатар перамог совецкага народа», «Аб вялікіх будоўлях комунізма на Волзе, Дану, Дняпры і Аму-Дар'і», «Аб сталінскім плане пераўтварэння прыроды» і інш.

Вечарам у Мінскім акруговым Доме афіцэраў імя К. Варашылава адбылася сустрэча воінаў Совецкай Арміі і працоўных горада з Героямі Совецкага Саюза і ўдзельнікамі баёў за Берлін.

На цэнтральнай вуліцы горада — Совецкай — адбыліся вялікія народныя гулянні.

Вечарам адбылося ўрачыстае адкрыццё [illegible] сезона ў парку культуры і адпачынку імя Горкага. На летняй эстрадзе парка выступалі артысты Ленінградскай дзяржаўнай эстрады, некалькі духавых аркестраў, лепшыя салісты і выканаўцы нашых сталічных тэатраў.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў гэтыя дні значна павялічыўся лік экскурсій і асобных наведвальнікаў. Яны падоўгу стаяць каля стэндаў, дзе змешчаны каштоўныя матэрыялы, якія расказваюць аб воінах-беларусах — удзельніках штурма Берліна. З паветра штурмаваў Берлін лётчык Пётр Гучок, ураженец Рудзенскага раёна Мінскай вобласці. За адвагу і мужнасць у барацьбе з гітлераўцамі П. Гучок быў удастоены высокага звання Героя Совецкага Саюза.

Удзельнічалі ў штурме Берліна Героі Совецкага Саюза беларусы Міхаіл Луста, Фёдар Архіпенка, артылерыст Герой Совецкага Саюза Н. Шэляпень, які праявіў цуды храбрасці ў баях на Фрыдрыхштрасе ў Берліне.

На гарадскіх і сельскіх кінаэкранах у гэтыя дні дэманстраваліся мастацкія кінакарціны: «Падзенне Берліна», «Сталінградская бітва», «Траці ўдар» і інш.

Учора ўвечары працоўныя Мінска з захапленнем глядзелі на рознакаляровыя агні святочнага салюта. Трыццаць артылерыйскіх залпаў урачыста прагучэлі над сталіцай рэспублікі.

Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

таварышу Н. М. Шверніку

Паважаны таварыш Старшыня!

8 мая ўсё працоўнае насельніцтва Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, а разам з ім усе міралюбівыя людзі па ўсёй Германіі, святкуюць 7-ю гадавіну вызвалення слаўнай арміяй Совецкага Саюза нямецкага народа ад панавання гітлераўскага фашызма.

Пачынаючы з 8 мая 1945 года, Совецкі Урад нястомна імкнуўся аказваць нямецкаму народу падтрымку ў стварэнні новага дэмакратычнага ладу і дапамагаць яму ў эканамічным і культурным будаўніцтве.

Прызнаючы права нямецкага народа на нацыянальную незалежнасць і самастойнасць, Совецкі Урад заўсёды выступаў за заключэнне мірнага дагавору з адзінай, дэмакратычнай і міралюбівай Германіяй.

Ноты Совецкага Урада ад 10 сакавіка і 9 красавіка 1952 года Урадам ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі з'яўляюцца асабліва паказальным і пераканаўчым доказам няўхільнай палітыкі міру Совецкага Саюза ў адносінах Германіі. Прапануемыя Совецкім Урадам Асновы мірнага дагавору гарантуюць Германіі пераадоленне расколу, аднаўленне нацыянальнай незалежнасці, унутраную палітычную свабоду і палітычнае і эканамічнае раўнапраўе ў знешніх зносінах, а таксама абарону граніц і суверэнітэту дэмакратычнай германскай дзяржавы.

Гэтыя ноты, якія ўказваюць шлях да мірнага і справядлівага вырашэння германскай праблемы, і ясная акрэсленая заява Генералісімуса Сталіна аб тым, што цяперашні момант з'яўляецца падыходзячым для ўз'яднання Германіі, пабудзілі міралюбівых людзей ва ўсёй Германіі пачаць узмоцненую барацьбу супраць ваеннага агульнага дагавору і рэмілітарызацыі Заходняй Германіі. Яны выклікалі шырокі народны рух за заключэнне мірнага дагавору на аснове совецкіх прапаноў і за агульнагерманскія выбары для стварэння германскага ўрада.

З удзячнасцю і радасцю вітае наша насельніцтва рашэнне Совецкага Урада аб перадачы ва ўласнасць нашага працоўнага народа 66 прадпрыемстваў Совецкіх Акцыянерных Таварыстваў. Гэтае вялікадушнае рашэнне даказвае тое вялікае давер'е, якое выяўляе Совецкі Урад да дэмакратычных сіл нашага народа. Яно садзейнічае свабоднаму развіццю германскай мірнай эканомікі і з'яўляецца выдатным і бескарыслівым укладам Совецкага Урада ў ажыццяўленне пяцігадовага плана нашай рэспублікі.

За гэтую шчырую і бескарыслівую палітыку дружбы і міру я выказваю Вам, таварыш Старшыня, а праз Вас Ураду і народам Совецкага Саюза з выпадку нашага Дня Вызвалення гарачую і шчырую ўдзячнасць усіх міралюбівых немцаў. Разам з тым мы шлём найлепшыя пажаданні совецкім народам, якія, ствараючы вялікія будоўлі комунізма, паказваюць чалавецтву бліскучы прыклад творчай мірнай працы.

З дружбай і павагай Ваш

В. ПІК.

Берлін, 8 мая 1952 года.

Прэзідэнту Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі

таварышу В. Піку

БЕРЛІН

Прыміце, таварыш Прэзідэнт, маю сардэчную ўдзячнасць за Ваша прывітанне з выпадку 7-й гадавіны вызвалення германскага народа ад фашысцкага ярма і найлепшыя пажаданні поспеху германскаму народу ў яго барацьбе за стварэнне адзінай, незалежнай, дэмакратычнай, міралюбівай германскай дзяржавы і за заключэнне мірнага дагавору.

Н. ШВЕРНІК.

Старшыні Совета Міністраў СССР

таварышу І. В. Сталіну

МАСКВА

Глыбока паважаны Генералісімус **Сталін!**

У дзень 7-й гадавіны вызвалення германскага народа ад гітлераўскага фашызма я перадаю Вам, паважаны таварыш Сталін, ад імя Урада Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і асабіста ад сябе сардэчнае прывітанне. З глыбокай удзячнасцю мы схіляем свае сцягі перад храбрымі героямі слаўнай Совецкай Арміі, якія загінулі ў барацьбе за вызваленне германскага народа ад гітлераўскага фашызма.

Насельніцтва Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі сустракае дзяржаўнае свята 8-га мая ў момант, калі вырашаюцца важнейшыя для германскай нацыі пытанні. Справа ідзе аб выкарыстанні тэрыторыі Германіі для заваявання Еўропы амерыканскім імперыялізмам і яго нямецкімі васаламі з Бона. Гэтая пагроза міру ў Еўропе выклікае для Германіі небяспеку братазабойчай вайны і поўнага разбурэння Германіі. Раскол Германіі паглыбляецца, а адмова ад заключэння мірнага дагавору спрыяе адраджэнню германскага мілітарызма і фашызма.

Шматлікія прыклады даказваюць, што патрабаванні адзінства, міру, незалежнасці і суверэнітэту германскай нацыі, выстаўляемыя германскімі патрыётамі, пастаянна знаходзілі бескарыслівую дапамогу і падтрымку з боку Совецкага Саюза. Германскі народ зноў бачыць гэта ў абодвух нотах Совецкага Урада ад 10 сакавіка 1952 г. і ад 9 красавіка 1952 г. Гэтыя дакументы ў поўнай меры адпавядаюць нацыянальным інтарэсам усяго германскага народа. Яны ўспрыняты таму ўсімі міралюбівымі і патрыятычна настроенымі людзьмі ва ўсёй Германіі з пачуццём унутранага задавальнення і глыбокай удзячнасці. Мы дзякуем Ураду Совецкага Саюза за яго прапановы, якія садзейнічаюць правядзенню выбараў ва ўсёй Германіі, утварэнню агульнагерманскага ўрада і заключэнню мірнага дагавору з Германіяй.

Мы дзякуем таксама за вялікую дзейсную дапамогу і падтрымку ў вялікай справе нашага мірнага, гаспадарчага і грамадскага будаўніцтва, асабліва за перадачу ў гэтыя дні ў рукі нашага народа 66 прадпрыемстваў САТ. Вялікія поспехі, дасягнутыя нашымі працоўнымі, дзякуючы гэтай дапамозе. Працоўныя Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і іх Урад будуць усімі сродкамі і з усёй энергіяй адбіваць любы напад на гэтыя дасягненні і любы ўдар супраць міру.

Германскі народ не хоча вайны! Германскі народ хоча жыць у адзінай, міралюбівай, незалежнай і дэмакратычнай дзяржаве як раўнапраўны член у сям'і міралюбівых народаў. Патрыятычныя і міралюбівыя сілы германскага народа, грамадзяне Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ўсведамляюць сваю вялікую адказнасць за ўмацаванне і захаванне міру ў Еўропе. Яны запэўняюць Вас, паважаны таварыш Сталін, што яны і далей будуць нястомна змагацца за захаванне міру.

Урад Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі

ГРОТЭВАЛЬ,
Прэм'ер-Міністр.

Прем'ер-Міністру Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі

таварышу О. Гротэвалю

БЕРЛІН

Прашу Урад Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і Вас асабіста, таварыш Прэм'ер-Міністр, прыняць маю ўдзячнасць за прыязнае пасланне з выпадку сёмай гадавіны вызвалення германскага народа ад фашысцкай тыраніі.

Жадаю германскаму народу і Ураду Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі поспехаў у барацьбе за адзіную, незалежную, дэмакратычную і міралюбівую Германію, за хутчэйшае заключэнне мірнага дагавору і вывад акупацыйных войск з Германіі — у інтарэсах Германіі і міру ва ўсім свеце.

І. СТАЛІН.

Работнікі літаратуры і мастацтва адзінадушна падпісаліся на новую пазыку

НА СХОДЗЕ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

6 мая пісьменнікі горада Мінска сабраліся на мітынг, прысвечаны выпуску Дзяржаўнай пазыкі развіцця народнай гаспадаркі СССР. Мітынг адкрыў намеснік сакратара партарганізацыі ССПБ М. Ткачоў.

З паведамленнем аб новай пазыцы выступіў пісьменнік П. Пестрак. Ён сказаў:

— Дзяржаўныя пазыкі ў нашай краіне маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне. Павялічваючы фінансавыя рэсурсы социялістычнай дзяржавы, яны садзейнічаюць хутчэйшаму эканамічнаму і культурнаму развіццю нашай краіны, яшчэ большаму ўмацаванню яе магутнасці.

Дзяржаўная пазыка ў нашай краіне— гэта росквіт нашай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, нашай социялістычнай культуры, гэта ўзвядзенне вялікіх будоўляў комунізма, гэта ўдар па ворагах міру.

З'яднаныя пад сцягам барацьбы за мір, за социялізм, народы ўсяго свету на чале з магутным Совецкім Саюзам, пад вадзіцельствам таварыша Сталіна перамогуць чорныя сілы імперыялізма.

Пісьменнікі П. Глебка, І. Шамякін, Я. Брыль, Т. Хадкевіч, Ул. Карпаў у сваіх выступленнях падкрэслілі выключнае значэнне дзяржаўных пазык у развіцці народнай гаспадаркі СССР і ў далейшым палепшанні матэрыяльнага і культурнага добрабыту народаў краіны социялізма.

Пасля мітынга ўсе пісьменнікі дружна падпісаліся на Дзяржаўную пазыку развіцця народнай гаспадаркі СССР.

У РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВА

Пасля ўрадавага паведамлення па радыё пастановы Совета Міністраў СССР аб выпуску Дзяржаўнай пазыкі развіцця народнай гаспадаркі СССР у тэатры оперы і балета адбыўся вялікі мітынг. Першым выступіў заслужаны артыст рэспублікі І. Мурамцаў. Ён сказаў:

— Выпуск Дзяржаўнай пазыкі работнікі тэатра разам з усім совецкім народам сустрэлі з выключным уздымам і радасцю. Нашы пазыкі служаць справе далейшага развіцця народнай гаспадаркі і социялістычнай культуры.

Сакратар партбюро тэатра В. Нікіфаровіч ў сваёй прамове сказаў:

— Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага правадыра і настаўніка Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна совецкі народ паспяхова будуе комунізм. Пазычаныя дзяржавай у насельніцтва сродкі выкарыстоўваюцца для будаўніцтва Куйбышэўскай, Сталінградскай, Кахоўскай ГЭС, Галоўнага Туркменскага, Паўночна-Крымскага і Паўднёва-Украінскага каналаў, для далейшага развіцця народнай гаспадаркі і культуры, для ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны і служаць інтарэсам усяго народа. Нашы пазыкі з'яўляюцца народнымі пазыкамі.

У сваіх выступленнях народны артыст БССР М. Дзянісаў і народная артыстка БССР Р. Млодэк заклікалі работнікаў тэатра дружна падпісацца на новую пазыку — пазыку міру і шчасця народаў.

Слова атрымаў галоўны дырыжор тэатра Л. Любімаў.

— Совецкія людзі, — сказаў ён, — добра ведаюць, што нашы пазыкі паскараюць наш няўхільны рух наперад па шляху да комунізма. Таму з вялікай радасцю кожны совецкі грамадзянін пазычае дзяржаве свае зберажэнні.

Пасля мітынга праведзена падпіска. Яна прайшла дружна і арганізавана.

* * *

Сведчаннем высокіх патрыятычных пачуццяў з'явілася дружная падпіска на Дзяржаўную пазыку развіцця народнай гаспадаркі СССР калектывам тэатра імя Янкі Купалы.

На мітынгу, прысвечаным падпісцы на пазыку, выступілі: народны артыст БССР, двойчы лаўрэат Сталінскай прэміі К. Саннікаў, народны артыст СССР, лаўрэат Сталінскай прэміі П. Малчанаў, лаўрэат Сталінскай прэміі Л. Драздова і заслужаны артыст БССР С. Бірыла. Усе выступаючыя гаварылі аб гатоўнасці совецкага народа дапамагчы роднай дзяржаве: сваёй адданай працай і сваімі сродкамі будаваць комуністычнае грамадства і мацаваць абароназдольнасць совецкай Радзімы.

Калектыў тэатра ў першы-ж дзень быў поўнасцю ахоплены падпіскай на пазыку.

* * *

Арганізавана прайшла падпіска на пазыку сярод беларускіх кампазітараў і мастакоў. Ад шчырага сэрца аддалі яны свае зберажэнні дзяржаве.

З поспехам прайшла падпіска на новую пазыку сярод удзельнікаў сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі, работнікаў Дзяржаўнай эстрады, выкладчыкаў і студэнтаў тэатральнага інстытута, кансерваторыі, музычнай школы, вучылішча і мастацкага вучылішча.

Падпіска на новую Дзяржаўную пазыку

У Акадэміі навук БССР: падпісваецца віцэ-прэзідэнт Акадэміі, народны паэт БССР Якуб Колас.

У тэатры імя Янкі Купалы: падпісваецца народны артыст СССР Б. Платонаў.

Фота Л. Папковіча, І. Салавейчыка.

Магутная зброя комуністычнага выхавання

Совецкі народ адзначыў важную дату— Дзень большэвіцкага друку.

Гэтае традыцыйнае свята з'яўляецца яркім сведчаннем глыбокай папулярнасці друку сярод самых шырокіх слаёў совецкага народа. Газета з'яўляецца ў нашай краіне неад'емнай часткай культуры, штодзённага жыцця, умовай ідэйнага і духоўнага росту чалавека.

У гэтым годзе Дзень большэвіцкага друку супаў з саракагоддзем з дня выхаду ў свет газеты «Правда», якая стаіць на чале прагрэсіўнага друку ўсяго свету.

Гісторыя «Правды» непарыўна звязана з усёй гісторыяй большэвіцкай партыі і нашага народа. «Правда» нарадзілася ў час рэволюцыйнага ўздыму ў пачатку 1912 года і з'явілася масавай газетай рабочага класа і працоўнага сялянства. Яна высока ўзняла баявыя традыцыі першых марксісцкіх газет—«Искры» і «Брдзолы», дапамагла перадавым рабочым згуртаваць вакол партыйнага сцяга шырокія слаі рускага рабочага класа.

Пачаўшы выходзіць у перыяд рашучай барацьбы большэвікоў супраць ліквідатараў, у перыяд, калі на Пражскай канферэнцыі ў студзені 1912 года меншавікі былі выгнаны з партыі, а большэвікі аформіліся ў самастойную Расійскую социял-дэмакратычную рабочую партыю (большэвікоў), «Правда» з'явілася органам марксісцкай партыі новага тыпу.

В. І. Ленін назваў «Правду» ластаўкай «той вясны, калі ўся Расія пакрыецца сеткай рабочых арганізацый з рабочымі газетамі». У ліпені 1914 года В. І. Ленін у «Дакладзе ЦК РСДРП на Брусельскай нарадзе» пісаў: «З 22-га красавіка 1912-га года старога стылю ў Расіі пачала выходзіць штодзённая рабочая газета «Правда», якая створана **дзякуючы** аднаўленню партыі на студзеньскай канферэнцыі 1912-га года і праводзіць... рашэнні гэтай канферэнцыі».

Таварыш Сталін указвае, што «Правда», нарадзіўшыся ў час рэволюцыйнага ўздыму, у славутыя «ленскія дні», знаменавала сабой ліквідацыю перыяду агульнай стомленасці ў краіне пасля сталыпінскай рэакцыі, магутнае прабуджэнне рускага рабочага класа да новай рэволюцыі, пачатак заваявання шырокіх мас рабочага класа на бок большэвікоў. «Правда» 1912 года — гэта закладка фундамента для перамогі большэвізма ў 1917 годзе».

З самага пачатку свайго выхаду «Правда» на працягу сарака год няспынна нясе ў народныя масы вялікія ідэі марксізма, згуртоўвае працоўных вакол партыі Леніна—Сталіна, узнімае іх на барацьбу за новыя і новыя перамогі. «Правда» дае нам выдатны прыклад самай цеснай сувязі з працоўнымі масамі, выказваючы іх самыя глыбокія, самыя карэнныя інтарэсы, змагаючыся за іх свабоду і шчасце. Вось чаму ў нашай краіне няма такога кутка, адкуль-бы ў газету «Правда» не пісалі рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя.

Знаходзячыся ў цэнтры барацьбы за партыйнасць, выхоўваючы пакаленне рэволюцыйнага пролетарыята, самых лепшых прадстаўнікоў якога народ з гонарам назваў пачэсным іменем «праўдзістаў», «Правда» падрыхтоўвала і накіроўвала рабочы рух да социялістычнай рэволюцыі, да звяржэння эксплаататарскага ладу і ўстанаўлення ўлады працоўных.

У дні Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі і ў час грамадзянскай вайны палымяныя заклікі «Правды» ўзнімалі на барацьбу за свабоду мільённыя масы працоўных і загартоўвалі іх мужнасць і адданасць. Калі совецкі народ перайшоў да мірнага будаўніцтва, Ленін і Сталін паставілі перад большэвіцкім друкам новыя гістарычныя задачы: выхаванне рабочых і сялян на канкрэтных прыкладах, фактах будаўніцтва совецкага жыцця, падтрыманне і беражлівае выхаванне ўсяго новага, перадавога, бязлітасная барацьба супраць адсталасці, коснасці, руцінёрства. І «Правда» падхапіла і канкрэтна ажыццяўляла гэтыя мудрыя ўказанні правадыроў рэволюцыі.

Нястомным калектыўным прапагандыстам і арганізатарам совецкіх людзей была «Правда» ў гады социялістычнай індустрыялізацыі народнай гаспадаркі і перабудовы сельскай гаспадаркі на социялістычны лад, у гады барацьбы за ажыццяўленне сталінскіх пяцігодак.

«Правда» нястомна выкрывала перад усім светам злачынныя планы міжнароднай імперыялістычнай рэакцыі, падкопы падпальшчыкаў вайны. Яе голас напаўняў сэрцы совецкіх людзей і ўсіх людзей свету мужнасцю і непахіснай упэўненасцю ў перамогу над крывавым фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Цэнтральны орган большэвіцкай партыі ўзнімаў на свяшчэнную барацьбу за свабоду і незалежнасць совецкіх патрыётаў часова акупіраваных ворагам раёнаў. Вось жывыя прыклады, якія паказваюць велізарнае значэнне «Правды» для развіцця партызанскага руху ў Беларусі. «Лётчыка, які прывозіў «Правду», — успамінае былы сакратар Мінскага абкома партыі Герой Совецкага Саюза В. І. Казлоў, — партызаны гушкалі на руках. Нумароў было мала, а жадаючых пачытаць — тысячы. Сяляне прыходзілі да нас за тысячу кіламетраў для таго, каб атрымаць нумар «Правды». Я бачыў такія экземпляры «Правды», якія прайшлі праз сотні вёсак, праз дзесяткі тысяч рук. Нягледзячы на выключна беражлівае абыходжанне, тэксту ў такіх газетах разабраць ужо было нельга, — здавалася, не ад дакранання пальцаў, а вачыма былі з'едзеныя радкі».

А былы рэдактар беларускай падпольнай газеты «Чэрвенскі партызан» тав. Шыдлоўскі расказвае: «28 красавіка 1942 года ў трох кіламетрах ад вёскі Смоленка Чэрвенскага раёна на маленькім астраўку сярод балота сабралася нас 14 чалавек. Слова ўзяў комуніст Пётр Іванавіч Іваненка. Ён сказаў наступнае:

— Дарагія таварышы! Мы становімся на цяжкі, небяспечны шлях партызанскай барацьбы. Не па прымусу, а па голасу свайго сумлення, па закліку роднай зямлі мы робім гэта. Аснову атрада мы заклалі. Няма сумнення, ён будзе расці— расці так, як растуць грыбы ў дажджлівае надвор'е. Атраду нашаму патрэбна імя. Я прапаную назваць яго іменем нашай газеты «Правда». «Правда», створаная Леніным і Сталіным, змагаецца за справу народа, за вялікую большэвіцкую праўду. І мы з вамі ўзялі зброю для таго, каб біцца за праўду...

Прапанова была прынята адзінагалосна. Прайшло нямнога часу. Наш малады атрад пасля разгрому варожага гарнізона на конях уехаў у вёску Чырвоны Турын. У галаве кавалькады палымнеў чырвоны сцяг. На адным баку яго быў вышыты партрэт таварыша Сталіна, на другім быў надпіс «Партызанскі атрад імя газеты «Правда».

Пад гэты сцяг з кожным днём станавіліся ўсё новыя і новыя змагары за справу Радзімы, за нашу праўду. З 14 чалавек мы выраслі да тысячы, з аднаго атрада — у брыгаду. Гэтая брыгада таксама насіла ганаровую назву — імя «Правды».

Пасля Вялікай Айчыннай вайны газета «Правда» — баявы арганізатар рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі нашай краіны на аднаўленне разбуранай фашыстамі гаспадаркі, на выкананне пасляваеннага пяцігадовага плана. Кожны новы пачын стаханаўцаў прамысловасці, транспарту, социялістычнай сельскай гаспадаркі праз «Правду» робіцца здабыткам мільёнаў працоўных.

Неацанімае значэнне для развіцця социялістычнай культуры маюць выступленні «Правды» па пытаннях літаратуры і мастацтва. «Правда» заўсёды своечасова, смела і рашуча выкрывала ўсе і ўсялякія праявы буржуазнай ідэалогіі ў літаратуры і мастацтве, пад якімі-б шыльдамі гэтыя праявы ні выступалі. Так былі выкрыты розныя вульгарызатарскія тэорыйкі новарапаўцаў, накіраваныя на ліквідацыю культурнай спадчыны, праявы фармалізма, натуралізма.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны «Правда» заклікае нашых пісьменнікаў, дзеячоў мастацтва, усіх работнікаў ідэалагічнага фронта няспынна павышаць большэвіцкую ідэйнасць і ўдасканальваць майстэрства твораў, пастаянна напамінае ім, што яны пастаўлены на перадавую лінію барацьбы за комунізм.

Асабліва вялікую ролю адыгралі выступленні «Правды» супраць антыпартыйнай групы крытыкаў-касмапалітаў, якія прыніжалі і ганьбілі дасягненні нашых айчынных вучоных, пісьменнікаў, мастакоў, арыентавалі ўвагу ў сваіх працах на замежную, буржуазную культуру.

Партыйны друк рэзка раскрытыкаваў нацыяналістычныя скажэнні ў вершы В. Сасюры «Любі Украіну», дзе ішла гутарка не аб совецкай социялістычнай Украіне, а аб нейкай Украіне спрадвечнай, абстрактнай.

Гэтыя выступленні дапамагаюць нашым пісьменнікам рабіць яшчэ вастрэйшым мастацкае слова — гэтую зброю барацьбы за комунізм.

Артыкулы «Правды» аб оперы, рэцэнзіі на спектаклі дапамагаюць дзеячам совецкага тэатральнага мастацтва выпраўляць недахопы ў сваёй рабоце, узнімаць совецкае мастацтва.

Нядаўна газета змясціла артыкул «Пераадолець адставанне драматургіі», дзе з глыбокай пераканальнасцю ўскрыты прычыны таго, чаму ў нас рэдка з'яўляюцца добрыя п'есы, чаму наша драматургія адстае ад запатрабаванняў жыцця.

Асноўная прычына гэтых недахопаў, указвае газета, у тым, што ў асяроддзі драматургаў і работнікаў тэатраў доўгі час бытавала фальшывая «тэорыя» бесканфліктнасці. «Правда» вучыць адлюстроўваць жыццё праўдзіва, не ўхіляцца ад паказу жыццёвых канфліктаў, супярэчнасцей.

Сорак год з дня выхаду «Правды»—гэта свята большэвіцкага друку, свята ўсяго совецкага народа і ўсіх прагрэсіўных людзей свету.

На будаўніцтве Кахоўскага гідравузла земснарад «Анега» пачаў капанне катлавана пад асноўныя гідратэхнічныя збудаванні. За гадзіну земснарад дастае з катлавана 1.200 кубічных метраў грунту і па трубаправоду выкідвае яго на левы бераг ракі Конка.

На здымку: вадалаз **Б. І. Коханаў** рыхтуе да спуску пад ваду вадалаза першага класа **В. А. Тэрноўскага** для агляду дна катлавана.

Фота **А. Фацеева** (Фотахроніка ТАСС).

Да 70-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы

Паседжанне рэспубліканскай камісіі

Створана рэспубліканская камісія па правядзенню 70-годдзя з дня нараджэння і 10-й гадавіны з дня смерці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

У саставе камісіі тт. І. М. Ільюшын (старшыня), К. П. Буслаў, П. У. Броўка, А. А. Куляшоў, В. В. Барысенка, І. Д. Варвашэня, Я. К. Цікоцкі, В. Н. Поздняк, П. В. Лютаровіч, Б. В. Платонаў, М. А. Мінковіч, В. Ф. Луцэвіч, З. П. Матузаў, П. Ф. Глебка, В. Вітка.

6 мая адбылося арганізацыйнае паседжанне камісіі.

На паседжанні прапанавана распрацаваць і прадставіць на зацверджанне мерапрыемствы па лініі Саюза совецкіх пісьменнікаў, Акадэміі навук, Міністэрства асветы, Камітэта па справах культасветустаноў, Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР, Дзяржаўнага выдавецтва і інш.

Распрацоўваюцца мерапрыемствы па ўвекавечанню памяці Янкі Купалы.

Чарговае паседжанне камісіі намечана правесці 12 мая г. г.

У дзяржаўным літаратурным музеі

7-га ліпеня гэтага года спаўняецца 70 год з дня нараджэння выдатнага беларускага пісьменніка Янкі Купалы.

Беларускі дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы разгарнуў вялікую падрыхтоўку да гэтай даты. Папоўніліся новымі экспанатамі залы музея. Тут прадстаўлены атрыманыя з музея А. М. Горкага фотакопія аўтографа Я. Купалы на кнізе вершаў, якую паэт падарыў А. М. Горкаму ў 1934 годзе, а таксама групавыя фота, звязаныя з удзелам народнага паэта ў рабоце Першага Усесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў.

Музеем вядаўна набыты партрэт Янкі Купалы, зроблены карандашом кіеўскім мастаком у час знаходжання Я. Купалы ў Кіеве на юбілейных урачыстасцях, прысвечаных Т. Шэўчэнку.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна ў сваіх сховішчах знайшла поўны чарнавы рукапіс пераклада «Слова аб палку Ігаравым», зробленага Янкам Купалам, які таксама перададзены музею.

У бліжэйшыя дні музей арганізуе ў Мінску і рэспубліцы купалаўскія чытанні, прысвечаныя тэмам: «Вобраз таварыша Сталіна ў паэзіі Янкі Купалы», «Творчасць паэта ў дні Вялікай Айчыннай вайны», «Янка Купала — народны паэт» і інш.

Купалаўскія дні на Украіне

Грамадскасць Украіны рыхтуецца шырока адзначыць сямідзесяцігоддзе з дня нараджэння Янкі Купалы.

Паэты Паўло Тычына і Тэрэнь Масэнка пераклалі «Паўлінку». П'еса будзе выпушчана кіеўскім выдавецтвам «Мастацтва».

Апрача раней выданых двух тамоў выбраных твораў Янкі Купалы і асобнага выдання паэмы «Над ракой Арэсай», Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры Украіны рыхтуе аднатомнік выбраных твораў Янкі Купалы.

Падрыхтавана да друку манаграфія Яўгенія Мазалькова «Янка Купала», удастоеная Сталінскай прэміі. Аўтар унёс на украінскае выданне рад змен і дапаўненняў.

Паэт Тэрэнь Масэнка закончыў і здаў у друк працу аб сувязях Янкі Купалы з культурай украінскага народа, з пісьменнікамі Украіны.

Саюз совецкіх пісьменнікаў Украіны стварыў камісію па святкаванню 70-годдзя Я. Купалы, якую ўзначальвае дырэктар інстытута мастацтвазнаўства, фальклора і этнаграфіі Акадэміі навук Украінскай ССР паэт Максім Рыльскі.

(Наш кар.).

Бацькоўскі абавязак

Выхаванню дзяцей у нашай краіне аддаецца велізарная ўвага. Дзеці — наша будучыня. На бацькоў ускладзена вялікая дзяржаўная адказнасць за выхаванне дзяцей. «Наш бацька і наша маці ўпаўнаважаны грамадствам выхаваць будучых грамадзян нашай Айчыны, яны адказваюць перад грамадствам», — гаварыў выдатны совецкі педагог А. С. Макарэнка.

Якую-б пасаду ні займаў чалавек, якім-бы добрым работнікам ні быў, але калі ён імкнецца ўхіліцца ад выканання свайго свяшчэннага бацькоўскага абавязку, яго чакае суровае асуджэнне совецкай грамадскасці.

Прыкра выглядаюць тыя людзі, якія сваімі паводзінамі лёгкадумна топчуць маральныя асновы совецкай сям'і.

Іх мала, гэтых людзей — адзінкі, але іх не павінна быць зусім у социялістычным грамадстве. Яны павінны быць выхаваны і сілай пераканання і сілай закона.

Мы назавем тут імёны некаторых з гэтых людзей, каб не маглі яны жыць бесклапотна, хаваючыся пад маскай сумленных грамадзян.

Калі Сашы Алёшыну было каля двух год, а яго брату Віці — некалькі месяцаў, памерла іх маці. Выхаванне дзяцей узялі на сябе пажылыя людзі Сцяпан Іванавіч Трушкевіч і яго жонка.

Суровы гэта быў час. Вораг лютаваў на роднай зямлі, паліў і грабіў маёмасць, знішчаў людзей. У такіх цяжкіх умовах Сцяпан Іванавіч гадаваў унукаў.

Закончылася вайна. Слаўныя воіны вярталіся дамоў. Народ святкаваў перамогу. Колькі радасных сустрэч перажылі людзі ў тыя дні. А дзеці! Хто забудзецца, як яны пасля пакутліва цяжкай разлукі сустракалі бацькоў!

Не адчулі гэтага шчасця Саша і Віця Алёшыны. Бацька іх не вярнуўся. Усюды ў дакументах яны лічыліся цяпер сіротамі.

На дапамогу Сцяпану Іванавічу прыйшла дзяржава. Тым, хто страціў бацькоў, яна замяняе клапатлівую маці і бацьку.

Браты Алёшыны растуць. Яны ўжо ў чацвертым класе. Закончыцца навучальны год — і Саша і Віця выедуць на адпачынак у піонерскі лагер.

А бацька Алёшыных, як цяпер стала вядома, жывы. Пасля вайны ён не вярнуўся да дзяцей, не аказваў і не аказвае ім ніякай дапамогі. З 1945 года ён набыў сабе другую сям'ю і кінуў яе, потым кінуў і трэцюю сям'ю, а цяпер мае чацвертую сям'ю і жыве ў Заслаўльскім раёне, працуе начальнікам цэха цагельнага завода. Аб кінутых ім дзецях ён, напэўна, і не ўспамінае. На жаль, у такіх людзей, як Алёшын, дзе-ні-дзе знаходзяцца яшчэ апекуны.

... У мінулым годзе Мінскі раённы аддзел народнай асветы, пазнаёміўшыся з жыццём дзіцячага дома Міністэрства мясцовай паліўнай прамысловасці, устанавіў, што ў дзіцячым доме ёсць дзеці, бацькі якіх жывыя і матэрыяльна добра забяспечаны.

Міністэрству мясцовай паліўнай прамысловасці было прапанавана перагледзець кантынгент дзяцей. Аднак Міністэрства не палічылася з гэтай прапановай. Яно і без гэтага ведала, чыіх дзяцей брала на дзяржаўнае забяспечанне. Калі дырэктар дзіцячага дома спрабаваў гаварыць на паседжанні калегіі аб тым, каб вярнуць некаторых дзяцей бацькам і ўзяць у дзіцячы дом тых, якія сапраўды маюць у гэтым патрэбу, яму сказалі: «Ваша справа выхоўваць таго, хто да вас прысланы». Чые-ж дзеці выхоўваюцца ў Ратамскім дзіцячым доме Міністэрства мясцовай паліўнай прамысловасці?

У г. Віцебску па вуліцы 10-ай Вінчэўскай ва ўласным доме пад нумарам 61 жывуць муж і жонка Серабраковы. Серабракоў займае пасаду бухгалтара Віцебскага абласнога паліўнага аддзела, а яго жонка вядзе хатнюю гаспадарку. Каб пазбавіцца лішніх клопатаў, дзяцей сваіх Валянціна і Арнольда яны аддалі ў дзіцячы дом Міністэрства мясцовай паліўнай прамысловасці.

У гэтым-жа дзіцячым доме выхоўваюцца дзеці грамадзянкі Бабічавай, якая працуе камендантам на торфзаводзе «Ганавес».

Старому чалавеку Сцяпану Іванавічу Трушкевічу прапанавалі змясціць унукаў у дзіцячы дом. Сцяпан Іванавіч адмовіўся. «Я яшчэ здолею выхаваць дзяцей...» — сказаў ён. Сцяпан Іванавіч ведае, як добра выхоўваюцца дзеці ў нашых дзіцячых дамах. Але пачуццё грамадзянскага абавязку не дазваляе яму ўхіліцца ад выхавання ўнукаў.

А вось калі сказалі Хаменка А. Л.— маладой жанчыне — аб тым, каб яна ўзяла з дзіцячага дома свайго адзінага сына, яна катэгарычна адмовілася. Зараз у асабістай справе яе сына ляжыць ганебны дакумент. Вось што ў ім сказана: «Я, Хаменка Анастасія Лук'янаўна, адмаўляюся ад выхавання свайго сына, Хаменкі Івана, які навучаецца ў 5 класе Ратамскай сярэдняй школы і знаходзіцца на выхаванні ў дзіцячым доме ММПП БССР».

Партыя і ўрад прыкладаюць усе намаганні, каб наша совецкая сям'я была моцнай і шчаслівай. Сям'я-ж не можа быць такой без дзяцей, без іх выхавання. Працэс выхавання дзяцей — гэта працэс выхавання сям'і. Выхаванне дзяцей у духу комунізма — гэта неўчарпальная крыніца нашага сямейнага шчасця, сямейнай радасці.

Людзей, якія зневажаюць свяшчэнныя бацькоўскія пачуцці, якія зводзяць сваю мараль да маралі хітрай зязюлі, што падкідвае сваіх птушанят у чужыя гнёзды, трэба смела выцягваць на суд совецкай грамадскасці.

С. ЦЯРЭШЧАНКА,
інспектар Мінскага РайАНА.

Экспедыцыі па збору фальклора

У Гомельскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Чкалава актыўна працуе навуковы студэнцкі гурток народнай творчасці. У мінулым годзе, у час летніх канікул, педінстытут сумесна з абласным Домам народнай творчасці арганізаваў экспедыцыю па збору фальклора ў Гомельскай вобласці. У экспедыцыі прынялі ўдзел 14 членаў гуртка. Былі сабраны песні, частушкі, казкі, прыказкі аб Вялікай Айчыннай вайне, аб партызанскім руху, аб аднаўленні і развіцці народнай гаспадаркі, аб любімых правадырах Леніне і Сталіне, аб барацьбе за мір і г. д. На падставе сабранага матэрыялу створаны рукапісны зборнік «Вусная народная творчасць Гомельшчыны», якім карыстаюцца студэнты інстытута пры вывучэнні курса «Совецкая народная творчасць».

Каштоўную ініцыятыву праявіла рэдакцыя абласной газеты «Гомельская праўда», надрукаваўшы ў нумары ад 13 красавіка гэтага года песні, частушкі, прыказкі і пагаворкі, сабраныя экспедыцыяй. Цеплынёй і задушэўнасцю вызначаюцца змешчаныя на старонцы песні «Сталін, родны бацька наш», «Калгасная застольная», «Нашы кок-сагызныя палі» і інш. Цікавымі з'яўляюцца частушкі «Мы пра Сталіна спяваем», «Я працую на заводзе», а таксама прыказкі і пагаворкі.

Літаратурныя чытанні

Па рашэнню Мінскага гаркома комсамола для моладзі горада праводзяцца даклады і літаратурныя чытанні, прысвечаныя тэме «Дружба В. І. Леніна і І. В. Сталіна». Нядаўна ў памяшканні клуба МДБ адбыўся літаратурны вечар. Перад моладдзю з чытаннем сваіх вершаў, прысвечаных вялікім правадырам Леніну і Сталіну, выступілі П. Глебка, М. Лужанін, А. Бачыла, А. Астрэйка і М. Калачынскі.

Байкі пра... малапісьменнага гусака

Паэт Эдуард Валасевіч надрукаваў у магілёўскай абласной газеце «За Радзіму» дзве байкі — «Вятрак і гусак» і «Пясняр і Камар». Напісаныя на тым узроўні, калі гавораць: не ўсё тое, што зарыфмавана, называецца паэзіяй, — новыя байкі Эд. Валасевіча звяртаюць на сябе ўвагу яшчэ адной асаблівасцю. Здзіўляе тая бесклапотнасць і абыякавасць, з якой аўтар і газета ставяцца да элементарных правіл беларускай граматыкі. Дакараючы ветрака, які толькі тое і робіць, што размахвае крыллямі, але не можа ніяк узняцца ў неба, другі персанаж байкі — гусак звяртаецца да яго з наступнай прамовай:

А я калі **не захачу** —
Бягу, плыву, лячу
Шыплю,
Шчыплю
І гагачу!..

Вятрак не застаецца ў даўгу і адказвае пранырліваму гусаку:

Не руш, сам бачыш, справаю заняты
Кручу цяжкія **жарнавы**
Мялю дзень збожжа
А ў начы — **дынаму ў рух прывожу...**

Яшчэ больш здзівіла чытачоў другая байка — «Пясняр і Камар». Аўтар расказвае ў ёй, як нейкі Пясняр, пакінуўшы зімовую кватэру, падаўся на дачу, каб у вольны ад рыбнай лоўлі і палявання час напісаць ні многа, ні мала — з паўтысячы радкоў. Выбраўшы зручную мясціну паміж маляўнічых пейзажаў, ён настроіўся на лірычны лад, і ўжо гатова была «паслухмяная рука» запісаць першыя радкі, як над ім неспадзявана навісла страшэнная небяспека.

... паслышаў тонкі камарыны звон
І не апамятаўся ён,
Як на ілбе узбух балючы гуз...

Але пясняр аказаўся не з палахлівага дзесятка. Ён смела рынуўся насустрач выпрабаванням лёсу, забіў камара і,

... нягледзячы на камарыны ўкус,
Не кінуў муз.

Уся гэтая «гісторыя» заканчваецца глыбокадумным абагульненнем:

Да мэты ўпарта трэба йсці
Нягледзячы на выпадковыя няўдачы
ў жыцці.

«Ёсць два віды бяссэнсіцы, — пісаў А. С. Пушкін: — адна вынікае з недахопу пачуццяў і думак, што замяняюцца словамі; другая з паўнаты пачуццяў і думак і недахопу слоў для іх выяўлення». Рэдакцыя газеты зрабіла-б большую карысць аўтару, калі-б нагадала яму гэтую ісціну, замест таго каб друкаваць бездапаможныя ад мастацкія вершы на сваіх старонках.

М. БАРСТОК

Аповесць аб совецкіх школьніках

Прысуджэнне дзіцячым пісьменнікам В. Асеевай і Н. Носаву Сталінскіх прэмій за 1951 г. сведчыць аб далейшым росце совецкай дзіцячай літаратуры і аб той вялікай увазе, якую аддаюць наша партыя і ўрад узняццю гэтага выключна важнага ўчастка літаратурнай работы.

Нікалай Носаў — не навічок у дзіцячай літаратуры. Самыя юныя чытачы — дзеці дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту — ведаюць і любяць яго кніжкі «Ступенькі», «Вясёлыя апавяданні».

Аповесць «Віця Малееў у школе і дома» таксама разлічана на дзяцей малодшага ўзросту. Героямі яе з'яўляюцца вучні чацвертага класа Віця Малееў і Косця Шышкін.

Напісаная ў форме дзённіка, апавядання аднаго з герояў — Віці Малеева, кніга з'яўляецца цікавым творам аб дзецях і для дзяцей. Але яна ў той-жа час з цікавасцю чытаецца і дарослымі, бо ў ёй ёсць жывыя чалавечыя характары, цеплыня і лірызм— усё тое, што робіць дзіцячую кніжку сапраўды мастацкім творам. У ёй раскрываецца рамантыка жыцця нашых совецкіх школьнікаў, іх барацьба за авалоданне ведамі.

Аб самых простых рэчах, аб звычайных буднях совецкіх школьнікаў можна пісаць цікава. І на самай справе, які сюжэт аповесці Н. Носава? Самы просты. Тут нават няма ніякіх элементаў прыгодніцтва, ніякіх незвычайных здарэнняў. Зместам кніжкі з'яўляецца жыццё і вучоба піанераў чацвертага класа з пачатку навучальнага года і да лютага, «... а люты — апошні месяц зімы. Хутка наступіць сакавік, і прыдзе вясна, і пацякуць ручайкі, і зазелянее трава, у лясах прачнуцца вожыкі і вужы і другія розныя звяры, і заспяюць птушкі, і зацвітуць кветкі», — так разважаюць героі ў канцы кніжкі. Храналагічна рамкі аповесці зусім ясна акрэслены. Што было з героямі за гэтыя шэсць месяцаў, як яны змагаліся за чэсць піанерскага звяна, класа, чаму навучыліся, якія цяжкасці пераадолелі на сваім шляху і як пры гэтым раскрыліся іх характары — гэта складае сюжэтную аснову твора.

Віця і Косця — галоўныя героі твора — займаюцца самымі звычайнымі справамі: рашаюць задачы, выконваюць хатнія заданні па рускай мове, вучаць геаграфію і іншыя школьныя прадметы, гуляюць у валейбол, у шахматы, наведваюць цырк, удзельнічаюць у вечарах самадзейнасці. Але жыццё іх не ідзе павольна і плаўна, без якіх-бы там ні было здарэнняў і канфліктаў. Канфлікт у аповесці нарастае, развіваецца і правільна вырашаецца аўтарам.

Нелюбоў да аднаго якога-небудзь прадмета, самаўнушэнне, што гэта ім не пад сілу, адсутнасць самадысцыпліны і правільнага рэжыму дня прыводзіць некаторых вучняў да адставання, да другагодніцтва. Нешта падобнае здараецца з Віцем Малеевым, якому цяжка давалася арыфметыка, і Косцем Шышкіным, які адставаў па рускай мове. Але няма непасільных прадметаў. Усё можна вывучыць, асвоіць і зразумець, толькі трэба сур'ёзна і сістэматычна займацца. Гэтую ісціну аўтар падае не як голую мараль, а раскрывае ў мастацкіх вобразах і пераканаўча. Гэтаму спрыяе апавяданне ад першай асобы, расказ самога хлопчыка аб тым, што было з ім і з яго таварышам па школе. Аўтар аповесці разам з героямі заходзіць у клас, на збор атрада, у кабінет дырэктара, на валейбольнае поле. Ён раскрывае перад чытачом «сакрэт» авалодання тым ці іншым прадметам, паказвае, якая гэта вялікая радасць і як гэта можна шпарка і правільна рашаць задачы, пісьменна пісаць.

У аповесці пастаўлена праблема выхавання волі, характару. Ад малога — з'есці пірожнае толькі ў наступны дзень вечарам, да вялікага ў межах школьнага жыцця — самастойна паўтарыць праграму трэцяга класа і перарашаць усе задачы, каб добра паспяваць па арыфметыцы ў чацвертым класе, — такі вынік выхавання волі героем аповесці.

Косцю Шышкіну, які далёка зайшоў, ідучы па шляху найменшага супраціўлення, прыходзіць на дапамогу піанерскі атрад, калектыў, што зацікаўлены ў тым, каб кожны яго член узнімаўся ўсё вышэй і вышэй, змагаючыся за агульную справу — за чэсць класа, школы. Вуснамі Віці Малеева раскрывае аўтар, якой павінна быць сапраўдная дружба паміж вучнямі, піанерамі. Не патураць слабасцям, не замоўчваць адмоўнае павінен сапраўдны таварыш, а ўказваць на гэтае адмоўнае і дапамагаць выправіць яго.

Аддаўшы так многа ўвагі юным героям, Н. Носаў не ўсё зрабіў для абмалёўкі вобразаў дарослых. Многія з іх зусім не ўдаліся аўтару. Недастаткова выразна выпісан і вобраз настаўніцы Ольгі Нікалаеўны, хоць яна і прысутнічае амаль што ва ўсіх раздзелах аповесці. Зусім слаба паказана маці Косці Шышкіна, а цётка Зіна толькі ўпамінаецца. Добра задуманы вобраз бацькі Віці — мадэльшчыка сталеліцейнага завода, але ён вельмі рана знікае са старонак аповесці. У гэтым творы дзіцячы калектыў выступае не замкнутым у самім сабе. Дарослыя прысутнічаюць у аповесці, аказваюць дабратворны ўплыў на дзяцей, дапамагаюць ім хутчэй зразумець складаныя з'явы жыцця. Запамінаюцца эпізоды з'яўлення дырэктара перад вучнямі, размова яго з Віцем і Косцем у кабінеце. Гэтая размова сапраўды выхоўвае, глыбока дзейнічае на дзяцей.

Совецкая дзіцячая літаратура папоўнілася яшчэ адным цікавым, займальным творам на школьную тэму — аповесцю Н. Носава «Віця Малееў у школе і дома».

Друкарня «Чырвоны друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 14.

Да дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве

У лістападзе гэтага года ў сталіцы нашай Радзімы—Маскве адбудзецца дэкада беларускай літаратуры і мастацтва. Гэта будзе першая пасляваенная дэкада, у якой прымуць удзел усе асноўныя мастацкія калектывы рэспублікі—тэатр імя Я. Купалы, тэатр імя Я. Коласа, тэатр оперы і балета, Рускі драматычны тэатр і другія калектывы. Ужо зараз ва ўсіх калектывах разгарнулася дзейсная падрыхтоўка да творчага рапарту беларускага совецкага мастацтва.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам кіраўнікі тэатраў імя Я. Купалы і Я. Коласа расказалі аб падрыхтоўцы да дэкады.

У тэатры імя Я. Купалы

Галоўны рэжысёр народны артыст РСФСР, лаўрэат Сталінскай прэміі І. Судакоў і дырэктар тэатра А. Тэлічан паведамілі: калектыў тэатра працуе зараз з высокім творчым запалам. Кожны творчы і тэхнічны работнік тэатра глыбока ўсведамляе велізарную адказнасць, якая ўскладаецца на іх у сувязі з падрыхтоўкай да дэкады. Маскоўскі глядач памятае наш тэатр па дэкадзе беларускага мастацтва ў 1940 годзе; вельмі добрае ўражанне пакінуў тэатр у масквічоў у часе сваіх гастроляў летам 1948 года. На гэты раз патрабавальны глядач сталіцы будзе чакаць ад тэатра імя Я. Купалы яшчэ большых творчых дасягненняў, і мы павінны прыкласці ўсе сілы, каб апраўдаць спадзяванні нашай роднай сталіцы.

Зараз тэатр працуе над чатырма дэкаднымі спектаклямі. Дэкадную праграму тэатра ўзначаліць любімы спектакль нашага гледача «Пяюць жаваранкі», узнагароджаны нядаўна Сталінскай прэміяй (рэжысёр К. Саннікаў). Нягледзячы на тое, што спектакль быццам-бы ўжо «адстаяўся», мы ўсё-ж працуем над яго ўдасканаленнем па лініі мастацкага афармлення і масавых сцэн. Удзельнікі спектакля прадаўжаюць шукаць новыя дэталі і рысы сваіх вобразаў, каб зрабіць іх яшчэ больш яркімі і запамінальнымі.

Зараз ідуць рэпетыцыі другога спектакля нашай дэкаднай праграмы «Шчасце паэта» — аб заснавальніку беларускай літаратуры Янку Купале, імя якога носіць наш тэатр (пастаноўка І. Судакова і П. Сушко, мастакі П. Масленікаў і М. Блішч, кампазітар А. Багатыроў). Над роляй Янкі Купалы працуюць два майстры нашага тэатра — нар. арт. СССР Б. Платонаў і засл. арт. БССР І. Шаціла.

З сучаснай совецкай драматургіі тэатр выбраў п'есу на гісторыка-рэволюцыйную тэму «Кастрычнік»—М. Чыаурэлі і М. Бальшынцова. Нас захапіла высокая і пачэсная задача — паказаць на сцэне нашага тэатра вялікія вобразы Леніна і Сталіна. Ролю В. І. Леніна ў гэтым спектаклі будзе выконваць народны артыст СССР П. Малчанаў, ролю І. В. Сталіна—народны артыст СССР Б. Платонаў (пастаноўшчык І. Судакоў, рэжысёр К. Саннікаў).

З велізарным натхненнем і творчым напружаннем над гэтым спектаклем працуе зараз увесь калектыў тэатра. Неўзабаве ўжо заканчваюцца рэпетыцыі. Выпуск спектакля мяркуецца ў чэрвені.

Руская класіка будзе прадстаўлена ў дэкаднай праграме спектаклем «Гора ад розуму» Грыбаедава (пастаноўшчык І. Судакоў, рэжысёр Л. Мазалеўская). Гэты спектакль будзе патрабаваць ад нас асаблівай творчай дасканаласці, бо маскоўскі глядач, добра знаёмы з ім па пастаноўках лепшых тэатраў сталіцы, міжвольна будзе параўноўваць яго з тым, што ён ужо бачыў. І нам хочацца, каб у гэтым параўнанні спектакль нашага тэатра быў па меншай меры не горшым.

Тэатр з нецярплівасцю чакае і спадзяецца, што драматург К. Крапіва хутка закончыць сваю новую п'есу аб жыцці і працы нашых рабочых. Гэтую п'есу мы таксама ўключым у дэкадны рэпертуар і тым самым дапоўнім яго важнейшай тэмай нашай сучаснасці.

У тэатры імя Я. Коласа

— Дэкада беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве, — сказаў дырэктар тэатра імя Я. Коласа І. Дорскі, — будзе самай лепшай праверкай творчых сіл нашых тэатраў, у тым ліку і тэатра імя Я. Коласа. Наша апошняя сустрэча з масквічамі была ў 1944 годзе, калі, вяртаючыся ў вызваленую ад фашысцкіх захопнікаў Беларусь, тэатр імя Я. Коласа выступіў у Маскве са сваімі спектаклямі. Мы ніколі не забудзем тае сардэчнае цеплыні і шчырасці, з якімі сустрэлі масквічы нашы спектаклі. Таму мы з глыбокім хваляваннем рыхтуемся да другой сустрэчы з маскоўскім гледачом, разумеючы, што зараз мы абавязаны паказаць яму наш творчы рост за пасляваенны перыяд. Мы разумеем яшчэ, што ацэнка нашага росту будзе зыходзіць і з таго, наколькі тэатр выкарыстоўвае ў сваёй дзейнасці ў першую чаргу творчасць беларускіх драматургаў.

Маскоўскі глядач прыдзе ў беларускі тэатр перш-на-перш для таго, каб пазнаёміцца з жыццём і працай беларускага народа. Вось чаму з вызначаных для дэкады спектакляў большасць пастаўлена і ставіцца па творах беларускай драматургіі. Тэатр прадаўжае працаваць над пастаўленым ужо спектаклем «Раскіданае гняздо» (рэжысёр А. Скібнеўскі) па драме Янкі Купалы. Гэты спектакль узначаліць наш дэкадны рэпертуар і павінен расказаць аб цяжкім дарэволюцыйным жыцці беларускага народа. Але якім-бы цяжкім ні было жыццё ў мінулым, наш народ ніколі не траціў аптымізма, светлай веры ў перамогу над цёмнымі сіламі соцыяльнага зла. Гэта пакажа другі наш дэкадны спектакль «Несцерка» (рэжысёр Н. Лойтэр), які ўжо больш дзесяці год не сыходзіць са сцэны тэатра. Аб сучасным жыцці беларускага народа раскажуць спектаклі, якія будуць пастаўлены па п'есах беларускіх драматургаў А. Кучара, В. Палескага і лірычная камедыя «Алазанская даліна» (рэжысёр М. Міцкевіч).

Пачэснае месца ў дэкаднай праграме нашага тэатра зойме спектакль «Ворагі» па п'есе М. Горкага. Для пастаноўкі гэтага спектакля тэатр запрасіў рэжысёра МХАТ І. Раеўскага.

Тэатр прадаўжае работу з П. Глебкам над п'есай «Святло з Усходу» з тым, каб уключыць яе ў дэкадны рэпертуар.

Такім чынам, мы імкнемся не толькі да тэматычнай, але і да жанравай разнастайнасці нашай дэкаднай праграмы.

Будучыя мастакі

У тэатры оперы і балета арганізавана выстаўка работ студэнтаў Беларускага мастацкага вучылішча, на якой прадстаўлена вялікая колькасць малюнкаў, эцюдаў, эскізаў, партрэтаў, тэатральных эскізаў, узораў прыкладнога мастацтва, тэматычных кампазіцый і скульптур. Некаторыя з іх маюць значную цікавасць. Так, напрыклад, невялікая карціна студэнта пятага курса В. Грамыкі «У партызанскай зоне» захапляе непасрэднасцю настрою і жыццёвасцю. Праўда, фігуры партызан намаляваны яшчэ недасканала, ім нестае выразнай формы. Адчуваюцца недахопы ў кампазіцыйнай будове. І ўсё-ж невялікая карціна прыцягвае ўвагу сваёй асноўнай вартасцю — выяўленнем самага істотнага і жыццёвага, таго, што перажыў мастак.

Вастрыню думкі і ўспрыймання жыццёвых з'яў можна знайсці і ў другіх работах студэнтаў, хоць ім таксама нехапае прафесійнай дасканаласці.

Невялікая кампазіцыя студэнткі пятага курса М. Дзянісавай «Вясковы паштальён», работа студэнта пятага курса М. Данцыга — «Юныя шахматысты», В. Ермоленкі — «Абмен вопытам» радуюць сваёй жыццёвасцю. Перад гледачом — праўдзівыя карціны з жыцця совецкіх людзей, іх працоўныя будні і радасці.

Ёсць прыклады і больш складаных задач, якія ставяць перад сабой паасобныя студэнты. Б. Іваноў у сваёй рабоце «У кастрычніцкія дні» спрабуе вырашыць гісторыка-рэволюцыйную тэму. Вядома, што для гэтай адказнай кампазіцыі патрабуюцца грунтоўнае веданне гісторыі рэволюцыйнай барацьбы народаў СССР, а таксама пэўны вопыт у гэтым жанры. Б. Іванову яшчэ цяжка справіцца з творам на гістарычную тэму. Яго работа цікавая не столькі дасканаласцю вырашэння сюжэта, колькі разуменнем сутнасці падзеі. У гэтым сэнсе Б. Іваноў паказвае сябе ўдумлівым і пранікнёным жывапісцам.

Здольнасці жывапісца выявіў у сваёй карціне «Урачыстае абяцанне» В. Гейман. Яму, як і другім яго аднакурснікам, уласціва ўважлівае стаўленне да кожнай дэталі кампазіцыі. Аднак, у значнай ступені В. Гейману перашкаджае павярхоўнае перайманне жывапіснай манеры майстроў.

Моманты перайманння асабліва моцна адчуваюцца і ў невялікай рабоце «Сяброўкі», якая належыць здольнаму студэнту пятага курса В. Цімафеенку. Аўтар задавальняецца агульным уражаннем, пазбягаючы моцнай мадэліроўкі фігур.

Залішняе захапленне «чыстым» жывапісам заўважаецца ў рабоце І. Басава «У час адпачынку», у якім губляецца жывы чалавек.

Заслугоўвае ўвагі карціна Ю. Пучынскага «Партызаны ля раненай Рымы Шаршнёвай». Цікавы сюжэт яшчэ не вырашаны поўнасцю і выглядае як эскіз, аднак гэта ўжо значны крок да сталай працы.

На выстаўцы экспаніравана многа партрэтаў. Лепшым з іх можна лічыць кампазіцыйны партрэт «Лірнік» В. Цімафеенкі.

З густам выкананы Б. Аркачэевым дэкаратыўныя работы — эскізы да спектакляў і натурныя малюнкі І. Стасевіча і В. Пасюкевіча.

Студэнт другога курса В. Маслыка праяўляе здольнасці ў галіне скульптуры. На выстаўцы прадстаўлены яго гіпсавыя партрэты.

Шматлікія працы студэнтаў, багата прадстаўленыя на выстаўцы, сведчаць аб значных дасягненнях Беларускага мастацкага вучылішча ў справе падрыхтоўкі новых кадраў совецкіх мастакоў.

П. ГЕРАСІМОВІЧ.

Дружба двух універсітэтаў

З года ў год мацнее дружба студэнтаў двух буйнейшых навучальных устаноў краіны Беларускага і Вільнюскага дзяржаўных універсітэтаў. На традыцыйных сустрэчах у Вільнюсе і Мінску студэнты брацкіх рэспублік абменьваюцца вопытам вучобы і работы. Кожная такая сустрэча, якая сімвалізуе сабой дружбу беларускага і літоўскага народаў, з'яўляецца справаздачай аб дасягненнях за мінулы год.

Традыцыйны час сустрэчы — вясна. У гэтым годзе вільнюскія студэнты прыехалі ў Мінск.

2 мая адбыўся вечар дружбы двух універсітэтаў. Сотні студэнтаў БДУ імя В. І. Леніна сабраліся ў памяшканні клуба МДБ для сустрэчы са сваімі літоўскімі сябрамі.

З прывітальным словам выступілі сакратар партыйнага бюро БДУ імя В. І. Леніна тав. В. Старавойтаў і дэкан прыродазнаўчага факультэта ВДУ тав. В. Хомскіс.

Пасля абмену падарункамі літоўскія студэнты далі канцэрт мастацкай самадзейнасці. Урачыста гучыць у выкананні студэнцкага акадэмічнага хора пад кіраўніцтвам П. Сліжыса кантата аб Сталіне кампазітара Аляксандрава на літоўскай мове. Добра зладжаны шматгалосы самадзейны калектыў з прафесіянальным майстэрствам спяваў літоўскія, беларускія, рускія і чэшскія народныя песні, песні совецкіх кампазітараў.

На сцэне — студэнцкі ансамбль песні і танца. Багатая музычная і харэаграфічная культура літоўскага народа выклікае агульнае захапленне.

Асабліва цёпла віталі беларускія студэнты літоўскую народную гульню «Канюшына» і народны літоўскі танец «Полька птушнікаў» у выкананні танцавальнага калектыва ВДУ.

У заключэнне вечара літоўскія студэнты спяваюць міжнародны гімн студэнтаў. Падхопленая ўсімі прысутнымі, доўга гучыць на беларускай і літоўскай мовах гэта песня аб міры і дружбе.

А. БУТАКОЎ

Моладзь аднаго тэатра

Бадай ні ў адным з нашых тэатраў другі тур агляду дасягненняў творчай моладзі не прайшоў так арганізавана, як у тэатры імя Ленінскага комсамола Беларусі. Ён працягваўся 8 дзён і закончыўся падагульняючай канферэнцыяй гледачоў.

Поспехі маладых актораў — гэта вынік штодзённай работы па выхаванню і вылучэнню моладзі тэатра, якая складае амаль палову яго калектыва і выконвае большасць вядучых роляў у спектаклях.

У гэтым годзе больш поўна выявілася рэжысёрскае дараванне заслужанага артыста БССР Г. Волкава, які паставіў тры спектаклі.

Калі спектакль «Аленькая кветачка» выклікае сімпатыі гледача ўмелым спалучэннем фантастыкі з рэалістычным вырашэннем вобразаў, то ў наступных спектаклях Г. Волкаў шукае новых, больш жыццёвых, больш рэальных тэм і новага іх сцэнічнага вырашэння.

Наступныя самастойныя работы Г. Волкава — «Трыццаць срэбранікаў» і «Юнацтва бацькоў».

Спектакль «Юнацтва бацькоў» — даволі значная падзея ў творчай біяграфіі тэатра. Гэта творчая ўдача маладога рэжысёра, які не супакойваецца на сваіх першых поспехах, самакрытычна ставіцца да іх і прадаўжае расці, імкнучыся найбольш канкрэтна вызначыць сваю творчую індывідуальнасць.

У маладзёжным аглядзе прынялі ўдзел як вядомыя ўжо гледачу акторы, так і тыя, якія найбольш ярка праявілі свае здольнасці толькі ў гэтым сезоне. Гэта — Т. Канавалава, О. Сонцава, Г. Чакаліна, А. Чурсанаў і другія.

Артыстка О. Сонцава мае ўсе неабходныя даныя для роляў лірычных гераінь. Гэта найбольш выявілася ў вобразе Алёнушкі ў спектаклі «Аленькая кветачка».

Маладая артыстка выступіла на аглядзе ў зусім процілеглай па свайму зместу ролі — Сцёпкі («Зыкавы»). Гэтую ролю артыстка выконвае лёгка, натуральна. У Сцёпкі ўсяго некалькі фраз, але яны запамінаюцца яркасцю, закончанасцю выканання.

Цікавыя творчыя магчымасці і ў арт. Г. Чакалінай. Яе тры ролі, паказаныя на аглядзе (Антаніна — «Ягор Булычоў і другія», Анда — «Вей, вецярок!», Маруся — «Юнацтва бацькоў»), зусім розныя па ўнутранаму і знешняму малюнку.

Артыстцы Т. Канавалавай уласціва шчырасць перажыванняў. Яна ўмее ясна і дакладна данесці думку, закладзеную ў вобразе. Гэта найбольш поўна раскрываецца ў спектаклі «Вей, вецярок!»

Сціплая і добрая ў выкананні Т. Канавалавай сіротка Барба. Але гневам і нянавісцю да гвалтаўнікоў гарыць яе вочы, калі яна заступаецца за безабароннага слабенькага сіраціну Гатыня, над якім бяздушна здзекуюцца злосныя насмешнікі.

Поспех гэтага хвалюючага паэтычнага спектакля ў многім вызначае таленавітая, пранікнёная ігра Т. Канавалавай.

Не менш удалася артыстцы і роля маладой рэволюцыянеркі Наташы Логінавай у спектаклі «Юнацтва бацькоў». Хоць у гэтай ролі драматычныя месцы ў выканаўцы і менш моцныя, але ў яе многа шчырага пачуцця і праўды перажыванняў. Палымяная, адданая справе рэволюцыйнай барацьбы, Наташа асветлена радасцю, упэўненасцю ў перамозе.

Б. Канцадалаў выступае на сцэне ўжо некалькі год. Ён — выканаўца такіх роляў, як Федзя Пратасаў («Жывы труп»), Лаўрэцкі («Дваранскае гняздо»), Улдыс («Вей, вецярок!»), Антон («Юнацтва бацькоў»). Але найбольшага творчага поспеху актор дамагаецца не ў гэтых ролях. Вобраз Швандзі ў «Любові Яравой» — вось сапраўдная творчая ўдача Б. Канцадалава, куды большая, чым Пратасаў і Улдыс, паказаныя на аглядзе. У ролі простага матроса, усёй душой адданага справе пролетарскай рэволюцыі, бязлітаснага да яе ворагаў, актор дамагаецца поўнага арганічнага зліцця з вобразам. Швандзя Б. Канцадалава палымяны, свядомы змагар за справу свайго народа. Але такой вось палымянасці нестае вобразу энергічнага комсамольца Антона ў спектаклі «Юнацтва бацькоў».

Значны поспех у гэтым спектаклі выпаў на долю Б. Уксусава. Яго Сцяпан Рабінін — разумны арганізатар першай комсамольскай комуны, слаўны сын гераічнага пакалення рэволюцыі і грамадзянскай вайны. Актор раскрывае багатыя якасці гэтага цудоўнага чалавека: яго гатоўнасць аддаць сваё маладое жыццё за справу, якой ён прысвяціў яго, вялікую чуласць да кожнага новага члена комуны і глыбокую высакародную любоў да Наташы.

Смела спрабуе свае акторскія магчымасці Б. Уксусаў у востра характарнай ролі Сямёна ў спектаклі «Любоў Яравая». Але гэты вобраз залішне гратэскавы.

Такі-ж недахоп уласцівы Б. Звераву ў адмоўных ролях. Тым не менш Б. Звераў умее стварацъ яркі знешні малюнак адмоўнага персанажа. Такі яго каптэнармус Касцюмаў і вартавы ў «Любові Яравой», такі-ж і гімназіст Валя Сасноўскі ў «Юнацтве бацькоў». Праўда, у ролі вартавога і гімназіста ён вельмі рэзкі і падкрэслівае якую-небудзь адну рысу характару: тупы спалох у вартавога, злосць у гімназіста. У выніку вобразы атрымаліся вельмі ўжо аднабаковымі.

У рознахарактарных ролях выступілі ў аглядзе артысты А. Макарава, Л. Хрол і В. Грэчынскі, якія таксама паказалі свой несумненны творчы рост.

З тонкім гумарам вядзе А. Макарава ролю недалёкай, пуставатай плаксы Фісы ў казцы «Аленькая кветачка», хвалюючым драматызмам напаўняе вобраз Наташы Логінавай («Юнацтва бацькоў»).

Псіхалагічнай складанасцю вызначаюцца ролі Л. Хрол. Такі вобраз, як Паўла («Зыкавы») патрабуе ад артысткі сцэнічнага майстэрства, акторскага вопыту, неабходнай мастацкай культуры. Не выпадкова, што вобраз Паўлы часта не ўдаецца выканаўцам. Але Л. Хрол у многім дапамагло правільнае рэжысёрскае вырашэнне П. Маркіным як усяго спектакля ў цэлым, так і кожнага вобраза ў паасобку. Рэжысёр пазбег той памылкі, якую дапускаюць некаторыя тэатры ў пастаноўцы гэтай п'есы. Ён не акцэнтуе ўвагу гледача на вядомым «трохкутніку» і гэтым ліквідуе небяспеку няправільнага, меладраматычнага гучання спектакля.

Хоць менш шырока прадстаўлены ў аглядзе А. Салаўёва, Ю. Уласаў і А. Вітошкін, але і яны паказаны ў ролях рознапланавага характару, па прынцыпу найбольшага, усебаковага раскрыцця і развіцця маладога таленту.

Такі метад работы з моладдзю — правільны метад выхавання совецкага актора. Ён з'яўляецца самай яркай асаблівасцю агляду, самым значным дасягненнем тэатра імя Ленінскага комсамола ў рабоце з маладымі акторамі.

Сцэна на кватэры Елінекаў. Злева направа: Марыя Елінекава — засл. арт. БССР **С. Станюта**; Юліус Фучык — арт. **Ул. Кудрэвіч**; Іозеф Елінек — нар. арт. БССР **Ул. Уладамірскі**, Мірэк — арт. **М. Лапідус**.

Фота **І. Салавейчыка**.

Р. ШКРАБА

Вялікае жыццё

Спектакль пра Юліуса Фучыка ў тэатры імя Янкі Купалы

Тэатр імя Янкі Купалы паказаў гледачу новы спектакль «Прага застаецца маёй» па п'есе украінскага драматурга Юрыя Буракоўскага (рэжысёр—Ус. Кухта, кансультант — народны артыст РСФСР, лаўрэат Сталінскай прэміі І. Судакоў, мастак — В. Хашкоўскі).

У аснову п'есы пакладзены падзеі, пра якія расказвае чэшскі пісьменнік-комуніст Юліус Фучык у сваёй выдатнай кнізе «Рэпартаж з пятлёй на шыі».

... Утульны куток гарадскога парка ў Празе. Дрэвы стаяць яшчэ голымі, але ў празрыстай дымцы, з якой выступаюць абрысы высокіх шпіляў, вострыя чарапічныя стрэхі, адчуваецца блізкае дыханне вясны. На пярэднім плане ўзвышаецца прыгожая статуя — маўклівая сведка сустрэч і расстанняў. Цяпер іншыя падзеі адбываюцца тут. Дзесьці побач грыміць ваенная музыка: па вуліцы, нібы на палігоне, маршыруюць фашысцкія салдаты. Вось адзін з іх, па-зладзейску аглядваючыся, паспешна падыйшоў да скамейкі, паставіў на яе ўкрадзеную недзе карціну і, дзелавіта ссунуўшы на патыліцу шапку, прыкідвае, колькі марак можна пакласці ў кішэню. Канвойны гоніць па дарожцы парка групу арыштаваных. Іх чакае турма і катаванні толькі за тое, што яны чэхі і не хочуць прызнаваць новы фашысцкі «парадак».

Змяняецца карціна за карцінай. Падмосткі сцэны ператвараюцца ў вялікі фронт барацьбы свабодалюбівага чэшскага народа супраць фашысцкіх акупантаў.

На долю драматурга выпала пачэсная і адказная задача — стварыць высакародны вобраз пісьменніка-комуніста сродкамі драматургіі, разгарнуць характары яго паплечнікаў па барацьбе ў сцэнічных вобразах, паказаць іх у дзеянні, намаляваць іх мастацкія біяграфіі сродкамі другога літаратурнага жанра.

Тэатральны калектыў, які бярэцца паказаць са сцэны вобраз Юліуса Фучыка, не можа не лічыцца з законным жаданнем гледача ўбачыць любімага героя такім, якім ён увайшоў у свядомасць са старонак сваёй кнігі. Прад'яўляючы такое патрабаванне да спектакля, нельга, зразумела, не лічыцца з тым драматургічным матэрыялам, які дае для ўвасаблення вобраза галоўнага героя п'еса.

Юліус Фучык уяўляецца нам як чалавек вялікай душы, крыштальна чысты комуніст. Яго палымянае сэрца ўвабрала ў сябе і пяшчотную любоў да блізкіх па духу і пераконанню людзей, і гордасць за іх нязломную сілу перад вялікімі выпрабаваннямі, і спапяляючы гнеў да ворагаў. Ён умее з дзіцячай непасрэднасцю радавацца хараству жыцця, умее любіць глыбока і ненавідзець усёй душой.

«Мы, комуністы, любім людзей. Нішто чалавечае нам не варожа, мы цэнім самыя маленькія чалавечыя радасці, умеем цешыцца імі, — пісаў Фучык у артыкуле «Пад сцягам комунізма» ў студзені 1942 г. — ...Мы, комуністы, любім мір. Таму мы змагаемся. Змагаемся з усім, што нараджае вайну, змагаемся за такую пабудову грамадства, пры якой ужо ніколі не змог-бы паявіцца злачынца, які дзеля выгад кучкі заправіл пасылае сотні мільёнаў на смерць, у шалёны вір вайны, на знішчэнне каштоўнасцей, патрэбных жывым людзям».

У гэтых словах — ключ для сцэнічнага ўвасаблення вобраза Фучыка. Тэатральны калектыў і рэжысёр спектакля правільна зразумелі ідэю спектакля, які павінен расказаць гледачу, як раскрыліся гэтыя глыбокачалавечныя рысы палымянага комуніста ў самыя цяжкія моманты гісторыі яго народа. Сюжэтная лінія Фучыка ў спектаклі непарыўна звязана з тэмай усенароднага змагання з фашызмам.

Аднак нельга не адзначыць, што малюючы вобраз Фучыка сродкамі драматургіі, Ю. Буракоўскі справіўся не ў поўную меру. Ён не здолеў унікнуць ілюстрацыйнасці, якая перашкаджае развіццю вобраза па ўзыходзячай лініі, не здолеў паказаць яго характар як сплаў высакародных якасцей, якія былі ўласцівы Фучыку. Артыст Ул. Кудрэвіч, які выконвае ролю галоўнага героя п'есы, па-сапраўднаму хвалюе гледача, паказваючы нязломную волю Фучыка, які, ведаючы, што яму падрыхтавана пятля, ні на хвіліну не траціць прысутнасці духу, знаходзячы ў сабе невычэрпныя сілы не толькі пераносіць нечалавечыя катаванні, але і натхняць на барацьбу другіх, кіраваць антыфашысцкім падполлем. У той-жа час вобраз многа траціць у сваёй прывабнасці, калі артыст імкнецца паказаць другую істотную рысу Фучыка — уменне марыць, радавацца, захапляцца шчаслівай будучыняй народа, якая надыйдзе, калі яго, магчыма, ужо не будзе ў жывых. Іншы раз міжволі ловіш сябе на пытанні, чаму тыя словы, якія некалі чытаў у кнізе Фучыка, гучаць са сцэны неяк прыглушана, не нясуць у сабе той страсці, якой яны напоўнены ў кнізе? І справа тут не толькі ў тым, што першае знаёмства з літаратурнымі высокамастацкімі вобразамі заўсёды бывае найбольш моцным. Адбываецца гэта, нам здаецца, таму, што ў п'есе гэтыя словы іншы раз набываюць характар звычайных рэплік, псіхалагічна не падрыхтаваных і таму пазбаўленых патрэбнай сілы ўздзеяння на гледача.

У кнізе ёсць такая сцэна. Пасля чарговага катавання Фучык страціў прытомнасць. Зняможанае цела пранізана пякучым болем. Хтосьці ўжо ў каторы раз аблівае яго вадой. Пакрысе вяртаецца прытомнасць. Вось ён ужо сядзіць, нейкая жанчына падае лякарства і пытаецца, што ў яго баліць. «...І тут мне здаецца, — расказвае Фучык, — што ўвесь боль у мяне ў сэрцы.

— У цябе няма сэрца, — гаворыць цыбаты эсэсавец.

— Ну, усё-такі! — кажу я і адчуваю раптоўную гордасць ад таго, што ў мяне яшчэ ёсць дастаткова сіл, каб заступіцца за сваё сэрца».

Скупая на словы сцэна, а як многа ў ёй сказана! Тут і адчай эсэсаўца, які страціў рэшткі надзеі што-небудзь даведацца ад сваёй ахвяры, і велічэ палымянага барацьбіта, які з радасцю адчувае, што ў яго яшчэ дастаткова сіл, каб весці барацьбу.

Падобная сцэна ёсць і ў спектаклі. Світае. Мінула пакутлівая ноч. Фучык ляжыць на падлозе. Гестапаўцы, п'яныя і стомленыя, пазіраюць асалавелымі вачыма на сваю ахвяру. Уваходзіць камісар антыкомуністычнага аддзела гестапа Бэм.

Бэм, звяртаючыся да следчага Фрыдрыха: Пратакол!

Фрыдрых разводзіць рукамі.

Нічога не сказаў?

Фрыдрых. М-м...

Бэм. У яго няма сэрца.

Фучык (ледзь чутна). Не, чаму-ж...

Тыя-ж словы, але глядач не адчувае за імі раптоўнай гордасці Фучыка, у якога яшчэ хапіла сіл, каб заступіцца за сваё сэрца.

Можна прыгадаць яшчэ сцэну, калі Фучык гаворыць свае крылатыя словы аб тым, што чалавек не робіцца меншым ад таго, што яго ўкароцяць на галаву. Падзеныя як рэпліка, яны зноў-такі гучаць неяк прыглушана, а не як пераконанне чалавека, загартаванае ў суровым выпрабаванні, абдуманае сам-на-сам са сваім сумленнем. І наўрад ці варта папракаць артыста і рэжысёра, якія не знайшлі нічога лепшага, чым падкрэсліць гэтыя словы паузай.

Вобраз, які стварае Ул. Кудрэвіч, нельга назваць дасканалым. Аднак не будзе перабольшаннем сказаць, што яго герой жыве на сцэне змястоўным жыццём. Ён запамінаецца гледачу, выклікае ў яго хвалюючыя думкі. Глядач бачыць, як цесна Фучыку, які прагне барацьбы і помсты, за тоўстымі сценамі Панкраца. Але ён не скардзіцца на свой лёс. Змрочныя сцены камеры ён ператварае ў акоп вялікай бітвы, далёка высунуты на пярэднюю лінію антыфашысцкага фронта. Фучык не толькі змагаецца ўсімі даступнымі ў яго становішчы сродкамі. Ён вучыць і загартоўвае другіх. Вялікай школай мужнасці з'явілася турма для старога чэха — настаўніка Пешэка і шахцёра Іржы, якіх шляхі помсты прывялі ў адну камеру з Фучыкам. Цярпліва растлумачвае ён сваім сябрам, што сапраўдныя барацьбіты і за кратамі не пакідаюць баявых радоў. Нябачнымі, але трывалымі ніцямі звязаны Фучык са сваім народам. На заводзе, які павінен вырабляць самалёты для фашысцкай арміі, працуюць сапраўдныя патрыёты, якія робяць усё, што могуць, каб самалёты не даляталі да лініі фронта. Так наказаў ім Фучык — член ЦК чэшскай компартыі. Ляцяць у паветра варожыя склады з бензінам, выходзяць падпольныя газеты. Ва ўсім гэтым ёсць доля энергіі і розуму Фучыка. І нездарма Бэм прызнаецца, што ў горадзе то тут, то там ён натыкаецца на сляды Фучыка, хоць той даўно сядзіць у турме.

Ярка і пераканаўча праводзіць Ул. Кудрэвіч сцэну, калі Фучыку стала вядомым аб нападзе фашыстаў на Совецкі Саюз. Скупымі і выразнымі жэстамі перадае артыст узрушанасць і ўнутранае хваляванне свайго героя. Нейкі час ён маўчыць, напружана думаючы над тым, што адбылося, потым пачынае шырокім паспешлівым крокам хадзіць па пакоі. У момант Фучык прымае важнае рашэнне. Ён пачынае дыктаваць ад імя ЦК чэшскай компартыі зварот да чэхаў і славакаў. Урачыста гучаць яго словы аб тым, што ў барацьбе совецкага народа з фашызмам вырашаецца і лёс яго радзімы.

Грунтуючыся на тым лепшым, што дасягнута артыстам у спектаклі, яму належыць прадоўжыць работу над вобразам Фучыка, дамагаючыся яго большай псіхалагічнай глыбіні і выразнасці.

Спектакль у мастацкіх вобразах даносіць да гледача высакародную ідэю аб усеперамагаючай сіле ідэй комунізма, аб натхняльным прыкладзе Совецкай краіны ў барацьбе за будучыню ўсяго чалавецтва. Драматургу і артыстам на жывых чалавечых вобразах удалося паказаць непераможную сілу народа, які ў самыя цяжкія часіны верыў у перамогу і змагаўся за яе. На месца закатаваных і вырваных з баявых радоў барацьбітоў прыходзяць новыя, каб прадоўжыць справу загінуўшых. Гестапаўцы пасадзілі за краты сувязную Марыю Елінекаву. Яе замяніла маладая дзяўчына Анна Клементс, якая ў барацьбе з ворагам знаходзіць меру помсты ворагу за сваё асабістае гора і гора свайго народа. Стары настаўнік Пешэк, якога гестапаўцы пасадзілі ў турму за тое, што ён чытаў вучням кнігу Фучыка «У краіне, дзе наша заўтра стала ўчарашнім днём», на вачах у гледача вырастае ў вялікага барацьбіта. «Юльча, ты пакідаеш нас, — гаворыць ён Фучыку, якога вядуць на суд, — але ведай: у камеры 267 зноў двое комуністаў».

Барацьба з фашыстамі з'явілася першым не па гадах суровым выпрабаваннем на годнасць чалавека і грамадзяніна для Ліды Плахі. Артыстка М. Громава добра перадае духоўнае хараство маладой чэшкі. Глыбока хвалюе сцэна, калі Плаха-Громава, зразумеўшы, што гестапаўцам

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Свята песні



На плошчы В. І. Леніна ў г. Гродна.

Фота В. Нікалаева.

У Гродна на плошчы імя В. І. Леніна адбылося гарадское масавае свята песні, прысвечанае Першаму мая.

Прыгожа афармленая партрэтамі вялікіх правадыроў партыі і Совецкай дзяржавы, лозунгамі і транспарантамі, плошча была запоўнена тысячамі гледачоў, якія прышлі паглядзець і паслухаць выступленні ўдзельнікаў самадзейнага народнага мастацтва.

Роўна ў дзве гадзіны дня зводны тысячны хор пад кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка клуба чыгуначнікаў Н. Гільдзюка ў суправаджэнні духавых аркестраў выканаў «Гімн Совецкага Саюза». У часе яго выканання многія гледачы, якія стаялі на плошчы, сумесна са зводным хорам натхнёна спявалі Дзяржаўны гімн социялістычнай дзяржавы.

Былі выкананы таксама «Мы — беларусы», «У абарону міру», «Кантата аб Сталіне».

Пасля паспяховага выступлення зводнага хора паказалі сваё майстэрства шматлікія танцавальныя калектывы горада і асобныя выканаўцы. Танцавальны калектыў рабочых табачнай фабрыкі (кіраўнік З. Някрасава) добра выканаў беларускі народны танец «Крыжачок» і украінскі народны танец «Гапак». Студэнткі культасветвучылішча тт. Дзякава, Нядзвецкая, Пузырэўская выканалі танец «Рускі перапляс». Студэнтка педагагічнага вучылішча М. Ефаненкава пад бурныя апладысменты прысутных памайстэрску выканала беларускую народную песню «Вечарком за рэчкаю» і рускую народную песню «У колодца», а студэнтка гэтага-ж вучылішча М. Голуб прачытала верш Ісакоўскага «Слова да таварыша Сталіна».

У гэтым годзе паказаў далейшы творчы рост танцавальны калектыў абласнога Дома піонераў пад кіраўніцтвам Л. Ляшэнка. Ён цудоўна выканаў «Спартыўны танец». Гэты танец вылучаецца свежасцю і арыгінальнасцю малюнка.

Добра прачытаў верш Ісакоўскага «Слова аб міры» рабочы-стаханавец табачнай фабрыкі тав. Сафронаў, байкі С. Міхалкова — работнік клуба чыгуначнікаў тав. Калабенін.

Свята песні, прысвечанае Першаму мая, было закончана выступленнем танцавальнага калектыва культасветвучылішча. Гэты танцавальны калектыў, апрануты ў яркія нацыянальныя касцюмы, з юнацкім запалам выканаў перад тысячамі гледачоў беларускі народны танец «Лявоніху». Выступленне некалькі разоў перапынялася ўсхваляванымі бурнымі апладысментамі прысутных.

Цікава прайшло свята песні ў Эйсмантаўскім, Мала-Берастовіцкім сельсоветах, а таксама раённым цэнтры Берастовіцы. Тут зводнымі хорамі былі выкананы песні «Лети, победы песня» Масаліцінава, «Калгасная песня аб Маскве» Маслава, «Мы выходзім калгаснай дружынай»—музыка самадзейнага кампазітара г. Гродна Івана Маціна і іншыя.

Больш арганізавана, чым у мінулым годзе, прайшло таксама гарадское свята песні ў Лідзе. Зводны гарадскі хор пад кіраўніцтвам выкладчыка педагагічнага вучылішча тав. Дроба выканаў песні: «У абарону міру», «Мы — беларусы», «Кантата аб Сталіне» і інш. Хор налічвае звыш тысячы спевакоў.

Пасля выступлення зводнага хора была паказана вялікая і цікавая святочная праграма харавых, танцавальных калектываў і асобных выканаўцаў.

Правядзенне ў гэтым годзе свята песні ў Гродна, Лідзе, у Берастовіцкім і радзе іншых раёнаў вобласці несумненна садзейнічала далейшаму ўздыму харавой самадзейнасці ў соўгасах, МТС і калгасах, на прамысловых прадпрыемствах, у школах і навучальных установах вобласці.

В. НОСАЎ.

Гродна.

У прэзідыуме ССП БССР

9 чэрвеня ў Мінску адбудзецца рэспубліканская нарада па дзіцячай літаратуры. На нарадзе будзе заслуханы даклад аб выніках работы ўсесаюзнай нарады па дзіцячай літаратуры і задачах беларускай дзіцячай літаратуры і садаклады: аб новых творах беларускай дзіцячай літаратуры (М. Барсток), совецкая школа і дзіцячая літаратура (нам. Міністра асветы БССР Казакоў), літаратура для дзяцей малодшага ўзросту (А. Бачыла), адлюстраванне работы піонерскай арганізацыі ў беларускай дзіцячай літаратуры (рэдактар часопіса «Бярозка» І. Есьман).

У нарадзе прымуць удзел пісьменнікі, настаўнікі, піонерскія, комсамольскія і бібліятэчныя работнікі.

* * *

Да 35 гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі Дзяржаўным выдавецтвам БССР будзе выдадзены зборнік «Жанчыны Совецкай Беларусі». Зборнік будзе складацца з нарысаў і артыкулаў жанчын — дзяржаўных дзеячоў, калгаснікаў, работніц, навуковых супрацоўнікаў, дзеячоў мастацтва, настаўніц і г. д. У асобных замалёўках будзе расказана аб удзеле совецкіх жанчын БССР у баях за Радзіму, аб жанчыне-маці і г. д. У стварэнні кнігі прымуць удзел беларускія пісьменнікі і журналісты: М. Лынькоў, А. Куляшоў, Я. Маўр, І. Шамякін, І. Грамовіч, А. Кулакоўскі, І. Мележ, Т. Хадкевіч, М. Танк, Я. Брыль, Э. Агняцвет, В. Лютава, П. Кавалёў, М. Вішнеўскі, І. Новікаў, Я Садоўскі, А. Шашкоў і другія. Рэдактар кнігі — І. Гурскі, складальнікі — А. Ус (рэдактар часопіса «Работніца і сялянка») і пісьменніцы Э. Агняцвет, М. Барсток. Памер кнігі — 40 друкаваных аркушаў.

* * *

Старшынёй камісіі па крытыцы пры прэзідыуме ССП БССР зацверджаны В. Барысенка.

ДЫЯЛЕКТАЛАГІЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

На працягу трох дзён у малой канферэнц-зале Акадэміі навук БССР працавала навуковая канферэнцыя па пытаннях дыялекталогіі ў святле сталінскага вучэння аб мове.

Два даклады — «Аб выніках работы над атласам рускіх гаворак цэнтральных абласцей РСФСР» і «Аб паняцці дыялектнага адрознівання і характары дыялектных адрозніванняў у рускай і беларускай мовах» — прачытаў доктар філалагічных навук прафесар Р. Аванесаў.

Загадчык сектара дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства АН БССР Ю. Мацкевіч у сваім дакладзе «Вынікі работы над дыялекталагічным атласам беларускай мовы за 1951 год» адзначыла, што ў мінулым годзе збор матэрыялаў для дыялекталагічнага атласа беларускай мовы быў наладжаны больш арганізавана і ў больш шырокіх маштабах, чым у папярэднія гады. Але якасць матэрыялаў, сабраных некаторымі педагагічнымі і настаўніцкімі інстытутамі (Бабруйскі настаўніцкі, Магілёўскі педагагічны), не адпавядае часамі патрабаванням праграмы.

На канферэнцыі таксама былі прачытаны даклады — «Формы назоўнікаў па матэрыялах дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (даклад кандыдата філалагічных навук М. Жыдовіч); «Вопыт апісання фанетычнай сістэмы адной беларускай гаворкі» (Чырвонаслабодскі раён Бабруйскай вобласці) — даклад навуковага супрацоўніка інстытута Н. Бірыла.

З паведамленнямі аб праробленай рабоце па збіранню матэрыялаў для атласа і абмеркаванню прачытаных дакладаў выступілі прадстаўнікі кафедры мовы педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў.

Былі наладжаны семінары: аб правядзенні фанетычных нагляданняў; аб правядзенні нагляданняў па марфалогіі і сінтаксісу; аб правядзенні нагляданняў па лексіцы.

Кінаэкспедыцыі

З Масквы ў розныя раёны краіны выехалі кінаэкспедыцыі студыі навукова-папулярных фільмаў.

У лясах Падмаскоўя пачаліся здымкі каляровага навукова-папулярнага фільма «Крылатая ахова» — аб карысных птушках, якія ахоўваюць лясы ад шкоднікаў-насякомых, аб засяленні дзяржаўных лясных палос пярнатымі.

У падарожжа па сталёвых магістралях краіны накіраваліся кінааператары, якія здымаюць фільм «Шчаслівай дарогі» — аб перадавым вопыце стаханаўцаў-чыгуначнікаў.

У Сальскіх стэпах кінаэкспедыцыя студыі працуе над стварэннем навукова-папулярнай карціны аб калгасе-мільянеру імя Сталіна.

Цікавая кінаэкспедыцыя намячаецца ў раён Волга-Данскога суднаходнага канала для стварэння каляровага навукова-папулярнага фільма «Арашаемыя землі Волга-Дона».

Для здымкаў чарговых кіначасопісаў «Навіны сельскай гаспадаркі» група аператараў выязджае ў Латвію, Казахстан, на Украіну і ў Краснадарскі край. За палярным кругам будзе здымацца фільм аб новых дасягненнях навукі ў галіне аленегадоўлі.

Усяго ў гэтым годзе Маскоўскай студыяй навукова-папулярных фільмаў намечана стварыць 80 кінакарцін, якія раскажуць аб дасягненнях навукі і тэхнікі, поспехах наватараў прамысловасці і перадавікоў калгасных палёў, аб багацтвах нашай Радзімы.

Сельскія чытачы

Глухавіцкая сельская бібліятэка — буйнейшая сярод сельскіх бібліятэк Брагінскага раёна Палескай вобласці. Яе фонд складае звыш 3500 кніг. Тут ёсць творы Владзіміра Ільіча Леніна і Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Багаты выбар сельска-гаспадарчай і мастацкай літаратуры. Побач з творамі совецкіх пісьменнікаў на паліцах — кнігі класікаў рускай і зарубежнай літаратуры.

Кніга трывала ўвайшла ў быт працаўнікоў калгаснай вёскі. Бібліятэкай карыстаецца 455 чытачоў. Асабліва людна ў бібліятэцы ў суботу і нядзелю. Пасля напружанага працоўнага тыдня хлебаробы прыходзяць абмяняць кнігі, пацікавіцца навінкамі, якія атрымала бібліятэка. Перад столікам бібліятэкара Маі Кончыц — чарга. Да століка падыходзіць Ціхон Майсеенка — калгаснік з трэцяй паляводчай брыгады. Ён здае другі том рамана А. Талстога «Пётр I» і просіць раман Ажаева «Далёка ад Масквы». Попыт на кнігі лаўрэатаў Сталінскіх прэмій надзвычай вялікі.

Ціхон Майсеенка захапляецца кнігамі аб слаўным мінулым нашай Радзімы. Ён прачытаў гістарычныя раманы А. Талстога, Чапыгіна, Тынянава, «Пераяслаўскую раду» Рыбака, «Порт-Артур» Сцяпанава. Майсеенка чытае многа кніг і на сучасныя тэмы. Ён напамяць ведае цэлыя ўрыўкі з п'есы Крапівы «Пяюць жаваранкі», прачытаў раман «Жніво» Нікалаевай і інш.

Ціхона Майсеенка змяняе Аляксандра Душка. У гэтым годзе яна прачытала «Ціхі Дон» Шолахава, «Жывую ваду» Кажэўнікава, «Родны дом» Караваевай. Зараз яна хоча прачытаць раман Мальцева «Усяго сэрца».

Член садова-гародняй брыгады Уладмір Васіленка, які прышоў разам са сваімі брыгадзірам — вопытным садоўнікам Аляксеем Казачэнкам — просіць дапамога ў кнігі «Садоўніцтва» і «Белую бярозу» Бубёнава.

У бібліятэку заходзяць настаўнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Настаўнік Іван Анісімавіч Нікіценка, які вывучае гісторыю партыі па першакрыніцах, атрымлівае ў асобным выданні геніяльную філасофскую працу В. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», настаўніца Х. А. Ярмоленка — працу І. В. Сталіна «Аб асновах ленінізма».

Калгасны шафёр Канстанцін Коў просіць «Глыбокую плынь» Шамякіна. Яму вельмі хацелася атрымаць раман у асобным выданні. На жаль, тры экземпляры кнігі ўжо на руках у чытачоў. Бібліятэкар падае шафёру падабраныя нумары «Полымя», дзе надрукавана гэтая кніга.

Любяць кнігу ў Глухавічах. Гэтаму яшчэ мала садзейнічае работа загадчыка бібліятэкі Маі Кончыц. Для прапаганды кнігі яна наладжвае выстаўкі і вітрыны, вывешвае тэматычныя спісы кніг, арганізоўвае калектыўныя чытанні. Сёлета калектыўна былі прачытаны «Глыбокая плынь» Шамякіна, «Белая бярозка» Бубёнава, «Тарас Бульба» Гогаля, урыўкі з «Адвержаных» Гюго. Зараз праводзіцца чытанне аповесці Брыля «У Забалоцці днее».

І. ХВОШЧАНКА.

Бібліятэка старшыні калгаса

Асабістая бібліятэка старшыні калгаса «За Радзіму» Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці тав. Кляменцьевай налічвае звыш 200 тамоў. Значнае месца сярод іх займаюць творы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна і іншая палітычная літаратура. Шмат кніг у бібліятэцы па пытаннях сельскай гаспадаркі і арганізацыі калгаснай вытворчасці — «Фінансавая справаздача і рахункаводства ў калгасе», «Пытанні арганізацыі калгаснай вытворчасці», «Севазварот калгасаў» і г. д. З мастацкай літаратуры ў бібліятэцы тав. Кляменцьевай — поўны збор твораў А. Астроўскага, «Вечары на хутары каля Дзіканькі», «Міргарад», «Мёртвыя душы» Н. Гогаля, творы Л. Талстога, В. Караленкі, А. Купрына і інш. Многа тут і твораў совецкіх пісьменнікаў-лаўрэатаў Сталінскіх прэмій.

Пастаяннымі чытачамі бібліятэкі тав. Кляменцьевай з'яўляюцца члены сельгасарцелі. Толькі за апошні час калгаснік Міхаіл Віктараў прачытаў кнігі «Палі польны абком дзейнічае», «Белая бяроза», «Севазварот калгаса» і інш. Многа прачыталі таксама калгаснікі Міхаіл Перагуда, Міхаіл Мінаеў, Валянціна Данілюк, Андрэй Пісарчук і інш.

У вольны час яны разам са старшынёй калгаса абмяркоўваюць прачытаныя кнігі, дзеляцца ўражаннем.

І. ГАЛІНОЎСКІ.

З замежнай пошты

Новая карціна Чарлі Чапліна

У адным з першых нумароў новага парыжскага прагрэсіўнага часопіса «Экран Франса» змешчана гутарка з Чарлі Чаплінам. Гутарыў з Чаплінам супрацоўнік часопіса Роберт Шау ў Амерыцы. Трэба сказаць, што на працягу многіх апошніх год праслаўлены актор не выступаў у друку.

Чарлі Чаплін перш за ўсё звяртаецца ў гэтай гутарцы да французскіх кінематаграфістаў. «Трэба выратаваць французскую кінематаграфію, — гаворыць Чаплін. — Гэта задача французскага народа, французскіх кінематаграфістаў, работнікаў мастацтва, усёй французскай інтэлігенцыі, усяго працоўнага народа краіны. І няхай французскія работнікі кіно, пры падтрымцы ўсяго народа, застануцца вернымі прынцыпам мастацкай смеласці і сумлення, якія дапамаглі ім у мінулым заваяваць высокае прызнанне ва ўсім свеце».

Перадавыя дзеячы французскага кіно каля двух гадоў назад пачалі барацьбу за вызваленне французскай кінематаграфіі ад амерыканскай апекі. Пры падтрымцы шырокіх слаёў французскага народа яны ў апошні час дабіліся значных поспехаў. Аднаўлены рад буйных французскіх студый, закрытых у свой час амерыканцамі, у якіх здымаецца нямала французскіх карцін. Пры гэтых умовах спачуванне Чарлі Чапліна французскім кінаработнікам у іх барацьбе за адраджэнне нацыянальнай кінематаграфіі надзвычай каштоўнае, асабліва калі ўлічыць той аўтарытэт, якім ён карыстаецца.

Далей у сваёй гутарцы Чарлі Чаплін дае такую характарыстыку сучаснай амерыканскай кінапрадукцыі:

«Механізацыя і стандартызацыя ў бягучай практыцы Галівуда дайшлі да сваёй мяжы і здольны забіць мастацтва. Галівуд дае цяпер свой апошні бой, і ён яго неміну́ча прайграе, калі не адмовіцца ад свайго бруднага і шэрага стандарту. Публіка рана ці позна перастане падтрымліваць галівудскую прадукцыю. Сімптомы гэтага ўжо ясна бачны...»

У сваёй новай карціне, здымка якой ужо заканчваецца, Чарлі Чаплін выступае супраць галівудскіх дзяльцоў, супраць стандартызацыі мастацтва. Карціна называецца «Агні рампы» («Лаймлайт»). Чаплін імкнецца перадаць у ёй тыя спадзяванні і мары, якія кіруюць дзейнасцю перадавых амерыканскіх мастакоў нашых дзён.

У сваёй карціне Чарлі Чаплін паказвае, што кіно ў руках буржуазных дзяльцоў з'яўляецца той сілай, якая губіць сапраўднае мастацтва. Дзеянне адбываецца ў 1914—1916 гг. у гады стварэння кінематаграфічных аб'яднанняў, калі амерыканскае кінамастацтва ператвараецца ў «бізнес».

Апрача Чарлі Чапліна, у фільме ўдзельнічае другі буйнейшы амерыканскі актор — Бэстэр Кітон, які іграе аднаго з амерыканскіх кінадзяльцоў. Кітон перанёс цяжкую хваробу, у выніку якой ён многі год не мог здымацца. У фільме таксама здымаюцца дзеці Чарлі Чапліна Міхаіл і Жазефіна і Жэральдзіна. Яны выконваюць ролі дзяцей галоўнага героя карціны.

Чаплін у новым фільме адыходзіць ад сваёй звычайнай маскі. Адухоўлены, амаль натхнёны яго знешні воблік мала паходзіць на Чарлі Чапліна мінулых карцін.

Аб жанравых асаблівасцях новай кінакарціны Чарлі Чаплін гаворыць: «Я думаю, што фільм будзе смешным, але ён павінен быць у той-жа час і сумным і кранальным. У ім ёсць трагічны пачатак. Я спадзяюся ўзнавіць усё жыццё з яго вытокаў і ў той-жа час паказаць карэнні мастацтва, паказаць, як нараджаецца творчасць і што ёй перашкаджае...»

Можна дапусціць, што новая карціна Чарлі Чапліна мае нейкія аўтабіяграфічныя рысы, бо сам Чарлі Чаплін вырас у сям'і вандруючых актораў маленькіх амерыканскіх тэатраў і на падмостках гэтых тэатраў яшчэ ў дзіцячыя гады пачаў сваё творчае жыццё.

«У Амерыцы, — гаворыць Чаплін, — ствараюцца тысячы фільмаў, грубых, вульгарных, напоўненых хваравітай сексуальнасцю. Многія з іх усхваляюць войны, забойствы і разбэшчанасць. Што можа даць Галівуд чалавецтву? О, калі-б можна было ўстанавіць міжнародны абмен кінакарцінамі, прытым такімі, якія-б не займаліся распальваннем агрэсіі ў розных відах, не прапагандавалі-б нацыянальную нянавісць, а гаварылі-б простай праўдзівай мовай аб жыцці простых людзей розных народаў! Бо толькі мільёны простых людзей могуць цяпер дабіцца міру, могуць выратаваць чалавецтва ад пагібелі».

І. БАРЫСАЎ.

Прабыванне ў Мінску дэлегацыі таварыства „Італія—СССР“

6 мая ў Мінск па запрашэнню Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай прыбыла дэлегацыя таварыства «Італія—СССР», узначальваемая сенатарам Віторыо Бардзіні. У складзе дэлегацыі — дзеячы культуры і мастацтва, грамадскія дзеячы, актывісты таварыства «Італія — СССР».

На Мінскім аэрадроме гасцей сустракалі старшыня праўлення Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай Г. Верасаў, старшыня выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных К. Длугашэўскі, старшыня праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР П. Броўка, народная артыстка СССР Л. Александроўская, прадстаўнікі працоўных сталіцы, дзеячы навукі, культуры і мастацтва.

У той-жа дзень замежныя госці прысутнічалі на прыёме, які быў дадзены старшынёй Мінскага гарвыканкома К. Длугашэўскім. За час свайго прабывання ў Мінску італьянскія дэлегаты наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, 21-ю сярэднюю жаночую школу, 7-ы дзіцячы дом і Палац піонераў, праслухалі оперу «Іван Сусанін» у Беларускім дзяржаўным ордэна Леніна Вялікім тэатры оперы і балета.

Міністр асветы БССР І. Ільюшын азнаёміў дэлегацыю са станам народнай асветы ў рэспубліцы. У час экскурсій па Мінску галоўны архітэктар горада Л. Мацкевіч расказаў гасцям аб паспяховым аднаўленні беларускай сталіцы і пазнаёміў іх з планам далейшага будаўніцтва.

Вялікае жыццё

(Заканчэнне).

усё вядома аб яе падпольнай дзейнасці, скідае з сябе маску свавольнай дзяўчынкі, якая ніяк не можа зразумець, за што яе пасадзілі ў турму, і ўступае ў адкрыты паядынак з гестапаўцамі. Ад яе патрабуюць назваць прозвішчы і адрасы членаў ЦК, абяцаючы выпусціць на волю. «Імёны?—перапытае яна.—Запісвайце!» Следчы з гатоўнасцю ўзяўся за аловак. Плаха ведае многа імён: «Ян! Вашэк! Вацлаў! Карэл! Славек! Францішак! Рудольф! Адрасы? Прашу. Прага! Браціслава! Прэшаў! Брно! Кладно! Табор! Уся Чэхаславакія!». Гэтая сцэна—адна з лепшых у спектаклі. Аднак калі свавольства Плахі зразумелае ў сцэнах з ворагамі, калі яна імкнецца заблытаць сляды, то на кватэры ў Елінекаў гэтыя натуральныя рысы яе характару ўспрыймаюцца іншы раз як найгрыш. Здараецца гэта таму, што артыстцы часам нестае прастаты і натуральнасці.

Цікавы вобраз чарцёжніцы Анны Клементс стварае артыстка Е. Рынковіч. Глядач блізка да сэрца прымае пакуты і радасці чэшскіх патрыётаў Іозефа (нар. арт. БССР Ул. Уладамірскі) і Марыі (засл. арт. БССР С. Станюта) Елінекаў, якія прынялі на свае старыя плечы вялікі і пачэсны цяжар барацьбы і не сагнуліся пад ім. Запамінаецца вобраз заўсёды вясёлага старога настаўніка Пешэка (засл. арт. П. Іваноў), які злосна здзекуецца над тупымі фашысцкімі салдатамі.

Галерэю прадстаўнікоў чэшскага народа дапаўняюць вобразы шахцёра Іржы (арт. З. Стома), рабочага падпольшчыка Здэнека (засл. арт. БССР П. Пекур), прадаўца газет Ірасека (арт. Л. Баранчык).

Асобна трэба спыніцца на вобразах Густы Фучыкавай і турэмнага наглядчыка Колінскага.

Нягледзячы на тое, што Густа займае ў спектаклі невялікае месца, артыстка Т. Аляксеева здолела паказаць яе чалавекам вялікага ўнутранага хараства і цеплыні. Стрымана іграе Т. Аляксеева драматычна напружаную сцэну вочнай стаўкі Густы з мужам у турме. Абое яны добра разумеюць, што гэта яшчэ адна спроба гестапа зламаць іх волю да барацьбы. Ні адным словам Фучыкава-Аляксеева не выдае свайго хвалявання. І толькі калі Густа з намаганнем адрывае вочы ад Фучыка, які пасля чарговага допыту не можа нават паварушыцца, гледачы адчуваюць, які невымоўны крык гора і гневу застыў у яе ясным позірку.

Роля Колінскага цяжкая для сцэнічнага ўвасаблення ў тым сэнсе, што ён больш дзейнічае за сцэнай, чым паяўляецца перад гледачом. Сумленны чэх, ён, выдаўшы сябе за немца, пайшоў працаваць у гестапа, каб быць звязваючым звяном паміж турмой і воляй. Суровы і засяроджаны, замкнуты ў сабе і асцярожны, Колінскі добра разумее, з якой пагардай глядзяць чэхі на ненавісны яму мундзір. Але мала хто ведае, якое палымянае сэрца патрыёта б'ецца пад гэтым мундзірам. Ён жыве пад пастаяннай пагрозай быць выкрытым гестапа. Пагарджаючы смерцю, Колінскі заўсёды з'яўляецца там, дзе можа парвацца сувязь. «Колін» — любоўна называе яго Фучык. Гэта дзякуючы яму палымяны комуніст змог не толькі кіраваць з турмы падполлем, але і напісаць сваю апошнюю кнігу. Такім стварае гэты вобраз артыст С. Хацкевіч. Хацелася-б толькі, каб артыст пашукаў больш выразныя фарбы для таго, каб паказаць глыбокую чалавечнасць свайго героя, яго надзвычайную прывабнасць і шчырасць.

Парадаваў гледачоў артыст Т. Кін-Камінскі, які выконвае ролю Бэма. Артыст не толькі здолеў унікнуць штампа, але і стварыў жывы і пераканальны вобраз каварнага і хітрага ворага. З першага з'яўлення Бэма на сцэне становіцца зразумелым: з такім змагацца нялёгка.

Паказваючы знешнюю наіграную прыстойнасць фашысцкага вылюдка, артыст у той-жа час бязлітасна і гнеўна выкрывае яго чорную чалавеканенавісніцкую душу.

Кожны жэст артыста прадуманы і адшліфаваны. Вось Бэм, даўшы волю сваім пачуццям, «філасофствуе» аб тым, што нацысты ператвораць чэхаў у рабоў. Колькі цынізма і нахабства ў яго самазадаволенай позе! Вось ён, утуліўшы галаву ў плечы, як затраўлены звер, ратуецца ад чарговага замаху.

Пры ўсёй разнастайнасці характараў Бэма і следчага Фрыдрыха, ролю якога выконвае артыст К. Сенкевіч, у іх ёсць многа агульнага. Тое, што Бэм імкнецца схаваць за ліслівымі словамі на допытах, Фрыдрых выказвае адкрыта і просталінейна. З якім цынізмам і нахабнасцю ён любіць паказваць ахвярам урны з попелам закатаваных ім людзей. Раптоўны пераход ад ліслівага шэпту да істэрычнага выкрыку выдаюць у ім сапраўднага ката. Артысты добра перадаюць гістарычную асуджанасць той справы, якой служаць гестапаўцы.

Вобразы людзей-аўтаматаў, паслухмянай і тупой сілы ў руках бэмаў і фрыдрыхаў, ствараюць артысты І. Лапцінскі, П. Бондараў і В. Гаратаў. Асабліва запамінаецца сатырычна завостраны вобраз гестапаўца Вілі, якога П. Бондараў малюе выразнымі сродкамі гратэска.

Спектакль «Прага застаецца маёй» у тэатры імя Янкі Купалы ў сцэнічных вобразах уваскрашае гераічныя старонкі жыцця і барацьбы чэшскага народа. Поспех тэатра набывае яшчэ большае значэнне, калі сказаць, што большасць роляў у спектаклі выконваюць маладыя артысты, якія паказваюць, што ў тэатры растуць таленавітыя майстры сцэны.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Алексей КУЛАКОЎСКІ, Пімен ПАНЧАНКА (намеснік галоўнага рэдактара).

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 74840. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 12.